Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
19 чэрвеня 2024 г.
СЕРАДА
№ 118 (30252)



ДАЛЬВА, СЯСТРА ХАТЫНІ

6

ЦЯГНІК ПАМЯЦІ: УРАЖАННІ

МС



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 18 чэрвеня падпісаў распараджэнне аб стварэнні пастаянна дзейнай рабочай групы па аналізе дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук.**
- Акцыя «Дарогамі славы» да 80-годдзя наступальнай аперацыі «Баграціён» пройдзе ў Беларусі.
- **Мінадукацыі ўводзіць папярэдні запіс на прастаўленне апастыля.**
- Кыргызстан закупіў першыя партыі беларускай малочнай прадукцыі на біржавых таргах.
- **Наймацнейшага магіляўчаніна абяруць у абласным цэнтры 29 чэрвеня.**
- Падмурак касцёла, як мяркуецца, XVII стагоддзя знайшлі пры раскопках у Валожыне.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ПЯРЦОЎ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Можа быць, моладзь сёння і іншая, але яна ўсё такая ж. Моладзь у нас патрыятычная, працавітая. Калі сваёй крыніцай забаў яны абралі не такія гульні, як былі ў нашага пакалення, а свае гаджэты, смартфоны і айпады, то, напэўна, гэта адзінае, што нас адрознівае. Разам з тым моладзь, вядома, больш паглыблена ў інфармацыйны парадак дня. Яна жыве ў гэтых інфармацыйных плынях значна больш, чым жылі мы, але ад гэтага яна праз сябе прапускае ўсю гэту інфармацыю, становіцца больш удумлівай і, як я ўжо сказаў, больш патрыятычнай».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МЫ АДКРЫТА ДАВОДЗІМ НАШЫ ПАДЫХОДЫ ЎСІМ. ХТО ХОЧА ПАЧУЦЬ — ТОЙ ПАЧУЕ»

## Пра нацыянальную бяспеку без прыўкрас і аб'ектыўна

**Праект нарматыўнага прававога акта, звязанага з пытаннямі ацэнкі стану нацыянальнай бяспекі, разгледзелі на пасяджэнні Савета Бяспекі з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.**

### Не толькі замацаваць, але і ўкараніць

У той ці іншы перыяд часу нам трэба выпрацаваць крытэрый ацэнкі стану нацыянальнай бяспекі. Улічваючы значнасць гэтага дакумента, прынята рашэнне правесці пасяджэнне Савета Бяспекі і разгледзець яго ў такім фармаце», — патлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што на VII Усебеларускім народным сходзе гаварылася аб неабходнасці перапрацоўкі адпаведнага ўказа ў развіццё новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. «Мы казалі аб тым, што Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі — гэта публічны дакумент, мы салідна вывучылі яго, на дыялогавых пляцоўках разгледзелі, а потым зацвердзілі на УНС. Але ў развіццё Канцэпцыі (гэта ў асноўным напрамкі агульныя, тэорыя) патрэбны канкрэтныя нарматыўна-прававыя акты, якія будуць яе канкрэтызаваць і прызямляць», — удакладніў ён. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што гэтыя дакументы з'яўляюцца неад'емнай часткай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, але на практыцы маюць закрыты характар.



Фота БелТА

«Канцэпцыя зацверджана. Нашы нацыянальныя стратэгічныя інтарэсы, пагрозы, прыярытэтныя кірункі іх нейтралізацыі, агульнае бачанне далейшага развіцця ў сферы бяспекі вызначаны. Тут усё вельмі ясна, — адзначыў Прэзідэнт. — Рэспубліка Беларусь — мірная краіна, заўсёды адкрытая для раўнапраўнага дыялогу і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Мы нікому ніколі не пагражалі. Больш за тое, адкрыта (у адрозненне ад іншых краін) даводзім нашы падыходы ўсім. Хто хоча гэта пачуць — той пачуе, нават калі і не хоча».

СТАР. 2

Клімат

# Ставім на цёплае лета

## Тры месяцы суцэльнай спякоты нам не абяцаюць

**Айчынныя сіноптыкі апошнім часам вельмі акуратна даюць доўгачасовыя прагнозы, але ў тым, што ў найбліжэйшыя месяцы будзе дастаткова цёпла і нават горача, сумняваецца не прыходзіцца.**

Спецыялісты службы метэаралагічных прагнозаў Белгідрамета лічаць: існуе вялікая доля верагоднасці, што сярэдняя тэмпература гэтым летам будзе крыху вышэйшай за кліматычную норму (на 1-2 градусы). Перыяды пацяплення будуць змяняцца больш халоднымі днямі. Але наколькі гэты перыяд будзе доўгім або наколькі спякота або пахаладанне — інтэнсіўнымі, вядома, з вялікай верагоднасцю сказаць немагчыма.

Сіноптыкі нагадалі, што беларусаў ужо не здзівіш тэмпературнымі арэлямі. Канец сакавіка і пачатак красавіка сёлета ў нашай краіне выдаліся анамальна цёплымі. У выніку ў сярэдзіне вясны зацвілі кустачкавыя і пачалася вегетацыя сельскагаспадарчых раслін, а затым рэзка прыйшоў холад. Такі перапад тэмпературы не спрыяе добраму ўраджаю, падкрэсліваюць спецыялісты.

СТАР. 5

Камунальныя стасункі

# ПРАВА НА КАПІТАЛЬНЫ РАМОНТ

## Пра яго тэрміны і якасць расказалі спецыялісты

**Прынцыпы правядзення капітальнага рамонту выклікаюць у людзей шматлікія пытанні. Чаму адзін дом уваходзіць у праграму па капрамонце, а такі ж дом-«аднагодка» не трапляе ў гэты спіс? Які пералік работ па капрамонце? Як уплывае на якасць яго выканання? На пытанні адказалі эксперты.**

### Згодна з планам

Падставай для пастаноўкі дома на капітальны рамонт з'яўляецца яго тэхнічны стан. У Мінску цяпер рамантуюцца дамы 1970—1980 гадоў пабудовы, пры гэтым сёлета капітальны рамонт прыйшоў і ў дамы на праспекце Незалежнасці, якія з'яўляюцца гісторыка-культурнай каштоўнасцю і пабудаваны ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. У цэлым па краіне большасць жыллёвага фонду, які ўключаны ў праграму капітальнага рамонту, — 1970-х гадоў пабудовы, але ёсць і 1980-х, і 1950-х. Напрыклад, у Мінскай вобласці рамантуецца вялікая колькасць дамоў малапавярховай забудовы плошчай да 1 тысячы кв. м 1950—1960 гадоў пабудовы.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X
24118

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2024 года
Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «МЫ АДКРЫТА ДАВОДЗІМ НАШЫ ПАДЫХОДЫ ЎСІМ. ХТО ХОЧА ПАЧУЦЬ — ТОЙ ПАЧУЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што толькі замацаваць асобныя палажэнні ў нарматыўных прававых актах недастаткова. Прыйшоў час укараніць гэтыя падыходы ў практыку. «Гэта значыць, мы павінны мець дакладнае ўяўленне аб тым, што рэальна адбываецца ўнутры краіны і вакол яе. Ваенная бяспека, эканоміка, сацыяльная, палітычная сферы і іншыя. Без прыўкрас, максімальна выверана і аб'ектыўна», — канкрэтызаваў ён.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся меркаваннем членаў Савета Бяспекі, спытаў, якая работа праведзена па ўдасканаленні дзеючай сістэмы ацэнкі стану нацыянальнай бяспекі, якім чынам прапанаваныя змяненні адпавядаюць новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі? «І, галоўнае, ці адлюстроўвае прапанаваная сістэма ацэнкі рэальны стан спраў у кожнай сферы нацыянальнай бяспекі? Вы ведаеце маё патрабаванне — фармалізму і спрашчэння тут быць не павінна. Ці згодны члены Савета Бяспекі са змяненнямі і дапаўненнямі, якія прапануецца ўнесці, або ёсць іншыя прапановы?» — задаў тон пасяджэння Прэзідэнт.

## Абраныя падыходы даказалі сваю эфектыўнасць

Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр Вальфовіч далажыў, што ў выкананне даручэння Прэзідэнта дзяржаўным сакратарыятам Савета Бяспекі распрацаваны праект Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні дакументаў па рэалізацыі Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі». Пасля зацвярджэння канцэпцыі на УНС гэта наступны важны этап ва ўдасканаленні заканадаўства ў гэтай сферы. «Мэта дакумента — з улікам новых змяненняў удакладніць парадак новай ацэнкі стану нацыянальнай бяспекі на аснове сістэмы індыкатараў, распрацаваных для кожнай з дзевяці сфер нацыянальнай бяспекі», — далажыў Аляксандр Вальфовіч. Пачынаючы з 2010 года дадзеная работа вядзецца ў адпаведнасці з Указам кіраўніка дзяржавы, у які за гэты перыяд тры разы ўносіліся змяненні і дапаўненні. Указ мае закрыты характар. «Замацаваныя ў ім падыходы на практыцы даказалі сваю эфектыўнасць. У той жа час жыццё не стаіць на месцы. Кардынальныя змены ў ваенна-палітычнай абстаноўцы, удасканаленне заканадаўства, з'яўленне новых методык ацэнкі запатрабавалі карэкціроўкі і адаптацыі дакумента да сучасных рэалій», — адзначыў Аляксандр Вальфовіч. Дзяржсакратар Савета Бяспекі расказаў, што работа над праектам указа будавалася па аналогіі з работай над Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі. «Мы захавалі ў дакуменце ўсё найлепшае, тое, што станоўча зарэкамендавала сябе на практыцы, і тое, што яшчэ не зарэкамендавала сябе. Пры гэтым улічылі новыя прапановы, ішлі ад рэальнай абстаноўкі, на аснове прапаноў упаўнаважаных дзяржаўных органаў, навукова-экспертнай супольнасці, вывучаючы замежны досвед. У поўнай меры выкарыстаны патэнцыял, напрацаваны міжведамаснымі камісіямі пры Савеце Бяспекі, найперш у сферы эканамічнай і інфармацыйнай бяспекі, абароны дзяржаўных сакрэтаў», — удакладніў ён. У цэлым, структура дакумента і агульны алгарытм работы засталіся без кардынальных змяненняў. Як і раней, за кожнай сферай замацаваны адказны орган, каардынатар і органы-выканаўцы, якія ў адпаведнасці з устаноўленымі індыкатарамі і іх парогавымі значэннямі праводзяць аналіз і даюць ацэнку. «Стан нацыянальнай бяспекі па кожнай сферы, як і раней, ацэньваецца па трох крытэрыях: стабільны, няўстойлівы і той, які патрабуе прыняцця неадкладных мер, што адпавядае замацаваным у Канцэпцыі паняццям рызыкі, выклікаў і пагрозы нацыянальнай бяспецы», — удакладніў ён. Агульную ацэнку нацыянальнай бяспекі рыхтуе Дзяржаўны сакратарыят Савета Бяспекі.

У прыватнасці, адна з навацый праекта ўказа — комплексная карэкціроўка індыкатараў нацыянальнай бяспекі і іх парогавых значэнняў, паказчыкі актуалізаваныя практычна ва ўсіх сферах нацыянальнай бяспекі.

## Зручна, своечасова і выгадна

Таксама Прэзідэнту прадставілі ўзоры новых прадметаў ваеннага адзення для ваеннаслужачых, падрыхтаваных Міністэрствам абароны па даручэнні кіраўніка дзяржавы. У ведамстве растлумачылі, што змяненні абумоўлены сусветнымі тэндэнцыямі, трансфармацыяй вучэбна-баявых задач, якія выконваюцца ваеннаслужачымі, а таксама неабходнасцю ўніфікацыі асобных прадметаў форменнага адзення для розных катэгорый ваеннаслужачых.

Усе новаўвядзенні — пералік і найменне прадметаў ваеннага адзення, іх колеравая гама — замацаваны ў праекце ўказа Прэзідэнта. Да выпуску плануецца тактычная кашуля, флісавая куртка, кашнэ летняе і зімовае для баявой формы адзення. Футравыя каўняры ў зімовых куртках заменяць на тэкстыльныя, а кант на форме ўнутраных войскаў МУС будзе выконвацца ў крапавым колеры — гэта даніна традыцыям. «Тактычная кашуля — абсалютна новы для нашых Узброеных Сіл элемент. Ён вельмі зручны пры выкарыстанні бронекамізэлькі, разгрузачных паясоў. Нават пры значных фізічных нагрузках ваеннаслужачы адчувае сябе даволі камфортна», — растлумачыў начальнік рэчавага ўпраўлення Міністэрства абароны Аляксей Кавалёў. Для жанчын у дадатак да паўсядзённай формы вырашана пашыць сукенкі. Вобраз будзе дапаўняць капялюш і гальштук-бант. У курсантаў з'явіцца так званы офісны камплект з курткі і штаноў (цяперашняя штодзённая форма з кіцелем будзе адзявацца на ўрачыстыя мерапрыемствы), на лета ім, як і салдатам, будуць выдаваць футболкі пола.

«Цана пытання?» — удакладніў кіраўнік дзяржавы.

«Цана пытання застаецца ранейшай за кошт павелічэння тэрмінаў нашэння, замены іншых прадметаў адзення», — сказаў Андрэй Бурдыка, намеснік міністра абароны па тыле — начальнік тыла Узброеных Сіл. Ён таксама адзначыў, што мадэлі перададзены ў войскі для апрабацыі.

«Вас задавальняе — добра. Грошай лішніх не прасіце. Так таму і быць», — рэзюмаваў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што, калі ўзнікае неабходнасць удасканаліць форму, не трэба чакаць некалькі гадоў. Гэтыя пытанні павінны вырашацца аператыўна.

Важна, што ўсе мадэлі выраблены на беларускіх прадпрыемствах і з айчынных тканін. У вытворчасці ўдзельнічалі флагманы тэкстыльнай прамысловасці — магілёўскі «Магатэкс» і мінскі «Камволь». Усяго ж у работу было ўключана каля 10 прадпрыемстваў швейнай галіны. «98 працэнтаў тканін, якія выкарыстоўваюцца для вырабу адзення, — гэта тканіны беларускай вытворчасці, і гэта радуе», — адзначыла старшыня канцэрна «Беллегпрам» Тацццяна Лугіна. Паводле яе слоў, пры вытворчасці новых узораў формы асаблівая ўвага была аддадзена ахоўным уласцівасцям адзення і яго зносаўстойлівасці.

«Адметнай рысай дадзенай калекцыі з'яўляецца і тое, што мы падумалі пра нашых дзяўчат, пра нясенне службы хлопцамі ў летні перыяд. Таму ў спісе абмундзіравання з'явілася летняе адзенне ў выглядзе сукенак, кашуль пола. А ў куртках, напрыклад, дадаўся капюшон. Хочацца, каб нашы ваеннаслужачыя розных відаў войскаў адчувалі сябе зручна ў любую пару года і ў паўсядзённай форме, і ў парадным адзенні», — расказала Тацццяна Лугіна.

Міністр абароны Віктар Хрэнін у размове з журналістамі адзначыў, што да ўдасканалення ваеннай формы стаўленне такое ж, як і да ўдасканалення ваеннай тэхнікі, — яно праводзіцца пастаянна. «Сёння мы бачым новыя формы вядзення баявых дзеянняў, з'яўляюцца новыя матэрыялы, новыя падыходы. Мы пастаянна ацэньваем досвед іншых краін па носцы, устойлівасці ваеннага адзення, практычнасці. Таму сёння прапанавана ўнесці змяненні ў некаторыя прадметы вопраткі, некаторыя прадметы дадаць. Але ў цэлым увесь спектр і лінейка формы адзення застаўся тым жа, што і былі зацверджаны Указам Прэзідэнта ў 2020 годзе», — адзначыў ён.

### У тэму

## Трэба ўвесь час трымаць руку на пульсе

**Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** у размове з журналістамі звярнуў увагу, што гэта пасяджэнне Савета Бяспекі планавае і ніякай надзвычайшчыны няма. «З улікам з'яўлення новых рызык і пагроз палітычная бяспека дапоўнена шэрагам новых індыкатараў, якія дазваляюць больш аб'ектыўна, рэальна і дакладна рэагаваць на сітуацыю ў палітычнай сферы для выпрацоўкі мэтазгодных рашэнняў па гэтым кірунку дзейнасці. Акрамя таго, ва ўказе з'явіліся новыя індыкатары, звязаныя з новай сферай — біялагічнай бяспекай. Вызначаны пяць кірункаў, па якіх будуць выпрацоўвацца канкрэтныя рашэнні. Каардынатарам вызначана Міністэрства аховы здароўя, — расказаў Аляксандр Вальфовіч. — Я думаю, што тыя новаўвядзенні, пра якія сёння далажылі, дадуць больш поўную і аб'ектыўную ацэнку стану нацыянальнай бяспекі».

На працягу года ўсе ведамствы, якія кантралююць розныя сферы нацыянальнай бяспекі, аналізуюць сітуацыю, даюць сваю ацэнку. Усё гэта акумулюецца ў канцы года ў дзяржаўным сакратарыяце Савета Бяспекі і штогод да 25 сакавіка гэты аналіз прадстаўляецца Прэзідэнту на зацвярджэнне. У выпадку пагрозы, якая запатрабуе неадкладных мер, яны будуць прыняты адразу, не чакаючы традыцыйнага даклада. «Пагрозы мы адсочваем на сістэмнай аснове і пастаянна інфармуем Прэзідэнта», — удакладніў ён.

«Адно з новаўвядзенняў, якое падтрымана, — пасля даклада Прэзідэнту выносіць гэту ацэнку на разгляд і зацвярджэнне Саветам Бяспекі для больш аб'ектыўнай ацэнкі карціны і для таго, каб на найбольш крытычных момантах (калі такія будуць) былі выпрацаваны канструктыўныя рашэнні, замацаваныя пастановай Савета Бяспекі», — адзначыў Аляксандр Вальфовіч. Па яго словах, усе крокі, накіраваныя на рэфармаванне і ўдасканаленне заканадаўства ў сферы нацыянальнай бяспекі, накіраваны найперш на захаванне стабільнасці і міру ў нашай краіне.

Дзяржсакратар Савета Бяспекі адзначыў, што Прэзідэнт у цэлым дакумент падтрымаў. З улікам невялікіх дапаўненняў ён будзе дапрацаваны. Аляксандр Вальфовіч ацаніў абстаноўку ў краіне як стабільную, але расслабляцца нельга. «Трэба ўвесь час трымаць руку на пульсе. Як сёння сказаў кіраўнік дзяржавы: мы павінны ведаць, што адбываецца ўнутры краіны, за яе межамі, каб апярэджваць нашых апанентаў хоць бы на адзін крок», — рэзюмаваў ён.

Адна са сфер нацыянальнай бяспекі — гэта нацыянальная бяспека ў ваеннай сферы, за якую адказвае Міністэрства абароны. Па словах **міністра абароны Віктара ХРЭНІНА,** змяненні ў геапалітычнай абстаноўцы, новыя выклікі і пагрозы прымусілі перагледзець метадалогію падыходаў у ацэнцы ваеннай бяспекі, што было і зроблена ваенным ведамствам на аснове зацверджанай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. «Новая метадалогія падыходаў у ацэнцы ваеннай бяспекі носіць своечасовы, аб'ектыўны і комплексны характар, звязана з пытаннямі і палітыкі, і эканомікі», — сказаў міністр.

**Міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР** заўважыў, што кіраўнік дзяржавы пастаянна робіць акцэнт на пытаннях стабільнай работы эканомікі. Пры абмеркаванні гэтай тэмы члены Савета Бяспекі засяродзіліся на сацыяльным, эканамічным, дэмаграфічным, навукова-тэхнічным кірунках. «Нас хвалююць пытанні, звязаныя з дыверсіфікацыяй экспарту, з ацэнкай работы эканомікі ў параўнанні з іншымі краінамі. Таму мы прапанавалі адпаведныя дапаўненні, паказчыкі, якія давалі б нам больш аб'ектыўную ацэнку ў гэтай сферы», — адзначыў міністр. Навукова-тэхнічны кірунак важны з пункту гледжання тэхналагічнай і лічбавай бяспекі. Па меркаванні міністра, падыходы да ацэнкі ў гэтых галінах трэба ўзмацніць, каб падштурхнуць рэгулятары да больш дынамічнай работы. І ключавая — сацыяльна-дэмаграфічная сфера. У гэты блок паказчыкаў, паводле слоў Юрыя Чабатара, плануецца ўнесці больш за ўсё змяненняў і дапаўненняў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

---

Абітурыент-2024

## Я ў рабочыя пайшоў бы...

**У краіне 15 чэрвеня стартаваў прыём дакументаў на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Працягнецца ён да 23 жніўня, плануецца, што ў каледжы Беларусі будуць прынятыя 39 тысяч чалавек.**

Адразу — аб галоўным. На ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі зменены тэрміны падачы дакументаў, і прыёмныя кампаніі для дзевяцікласнікаў і адзінаццацікласнікаў праходзяць практычна ў адзін і той жа час. Прыём дакументаў на ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі працягнецца наступным чынам: з 20 ліпеня да 3 жніўня — на бюджэт для выпускнікоў 9-х класаў; з 20 ліпеня да 6 жніўня — на бюджэт для выпускнікоў 11-х класаў.

Большасць каледжаў будзе весці прыём па конкурсе сярэдняга бала атэстата. Але ёсць выключэнні. Без экзаменаў не абысціся тым, хто паступае на спецыяльнасці «Спартыўна-педагагічная дзейнасць» і «Фізічная культура». Іспыт пры паступленні будуць трымаць і тыя, хто абраў сабе спецыяльнасць з творчых кірункаў.

Як паведамілі ў Міністэрстве адукацыі, у гэтым годзе павысіцца колькасць абітурыентаў, якія будуць паступаць у каледж пасля заканчэння базавай школы. Раней міністр адукацыі Беларусі Андрэй Іванец агучыў, што цяпер пасля 9 класа месцам навучання выбірае каледж кожны другі школьнік, а літаральна 2-3 гады таму гэта быў кожны трэці выпускнік базавай школы. На думку кіраўніка ведамства, менавіта гэты кірунак сёння з'яўляецца адным з перспектыўных і яго будуць развіваць далей.

Зрабіць цікавым навучанне ў каледжах, а працоўныя прафесіі прывабнымі — такую мэту ставяць сёння зацікаўленыя міністэрствы, ведамствы, арганізацыі. І для таго, каб так было, робіцца шмат і нават болей. Напрыклад, у краіне створаны 52 цэнтры кампетэнцый, дзе навучэнцы праходзяць падрыхтоўку на сучасным вытворчым абсталяванні. У каледжах спыніюць прыём на спецыяльнасці, якія сёння страцілі актуальнасць, і адначасова адкрываюць набор на новыя, запатрабаваныя на высокатэхналагічных вытворчасцях, у сферы абслугоўвання і іншых сферах эканомікі. Акрамя таго, з году ў год у каледжах павялічваецца колькасць мэтавых месцаў.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

---

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы Алене Генадзеўне Пархімчык у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МУЖА.**

Жніво-2024

# ВЫХАПІЦЬ ДОБРЫ ХЛЕБ У ДАЖДЖУ

## Такую задачу ставіць кіраўнік Мінскай вобласці аграрыям

**Сельскагаспадарчыя арганізацыі цэнтральнага рэгіёна ва ўсю рыхтуюцца да ўборачнай кампаніі. На якой стадыі гатоўнасці знаходзяцца прадпрыемствы вобласці? Якія планы на летняе жніво ў Міншчыны? Гэта і многае іншае абмеркавалі на пасяджэнні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.**

У мінулую пятніцу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прымаючы кадравыя рашэнні, пазначыў ключавыя задачы для мясцовай вертыкалі, у ліку якіх — правядзенне ўборачнай кампаніі. Традыцыйнае патрабаванне кіраўніка дзяржавы да мясцовых органаў улады — пастаянна трымаць на кантролі і ў полі зроку сферу сельскай гаспадаркі, удзяляючы ёй самую пільную ўвагу. Прэзідэнт адзначыў, што ў гэтым сезоне прагнозы на ўраджай па многіх культурах добрыя. Цяпер стаіць задача яго захаваць і беражліва прыбраць.

«Прэзідэнт Беларусі гаварыў пра важнасць і сур'ёзнасць правядзення ўборачнай кампаніі, — акцэнтаваў **старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр ТУРЧЫН**. — Мы бачым умовы надвор'я. Не факт, што ўсё зменіцца ў лепшы бок і надвор'е будзе спрыяць. Магчыма, будуць дажджы, і нам неабходна кожны пагодны дзень быць максімальна мабілізаванымі і гатовымі да правядзення ўборачнай кампаніі, выхопліваць вельмі няпрэнны хлеб, які стаіць на палях Міншчыны. Неабходна ў аптымальныя агратэхнічныя тэрміны правесці азімую сяўбу. Тыя вынікі, якія мы дасягаем сёння азімымі збожжавымі і яравымі, ашаламляльна адрозніваюцца. У Мінскай вобласці планамерна ішлі да нарошчвання азімага клину, таму 400 тысяч гектараў, якія мы плануем на наступны год, — гэта вельмі сур'ёзная лічба! Неабходна падысці да гэтага ў поўным узбраенні, прыбраць усё своечасова, без страт, зааралць і правесці сяўбу, каб атрымаць годны вынік у наступным годзе».

Цяпер у сельскагаспадарчых і іншых арганізацыях, згодна з даведзеным графікам, вядуцца работы па кашэнні траў, рамонце тэхнікі, сельскагаспадарчых машын і інвентару. «Сёння ідзе масавая падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі, таму перад намі ставіцца задача ахапіць на 100 працэнтаў рамонтнымі работамі ўсе збожжаўборачныя камбайны і зернесушыльныя комплексы, што, у прынцыпе, практычна зроблена, — расказаў журналістам **першы намеснік старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Васіль СЫСОЕЎ**. — Нам неабходна выйсці на поўную гатоўнасць да 8 ліпеня, але пры гэтым мы ведаем, што ўборка пачнецца раней. Таму сёння самыя новыя камбайны ўжо ў страі. Яны рыхтуюцца праз тыдзень актыўна пачаць уборачную. Сёлета ў нас 62 тысячы гектараў азімага ячменю, а гэта практычна 15 працэнтаў уборачных плошчаў. Потым ідзём на азімы рапс, затым — на асноўную ўборку. З улікам таго, што складваецца на палях, разумеем, што ўборачная кампанія будзе не з лёгкіх. Нам трэба ўбраць вялікія аб'ёмы збожжа і саломы. З апошняй прыйдзецца працаваць асабліва старанна. Нацэльваем нашы кадры на прадукцыйнасць і аператыўнасць, таму што гэта — дастатак нашай Міншчыны ў наступным годзе».

Па стане на 7 чэрвеня ў сельскагаспадарчых арганізацыях і механізаваных атрадах вобласці маецца больш за 1600 збожжаўборачных камбайнаў розных мадыфікацый, якія будуць задзейнічаны на ўборцы збожжавых і зернебабовых культур. Гэтай колькасці камбайнаў дастаткова для ўборкі наяўных плошчаў у агратэхнічныя тэрміны. Сярэдняя нагрузка на адзін камбайн складзе 324 гектары. Акрамя таго, для работ закупяць 150 энерганасычаных трактароў. Амаль 40 ужо паступілі ў гаспадаркі. Уся збожжаўборачная тэхніка павінна быць гатовая да 25 чэрвеня.

Пасяўная плошча збожжавых і зернебабовых культур пад ураджай 2024 года складае 510 тысяч гектараў, у тым ліку азімыя збожжавыя культуры захаваліся на плошчы 348,3 тысячы гектараў, плошча яравых збожжавых і зернебабовых культур з улікам плошчы перасеву загінулых азімых культур складае 161,7 тысячы гектара.

На Міншчыне пасеялі 8,6 тысячы гектараў лёну-даўгунцу, 38 тысяч гектараў цукровых буракоў, 7,2 тысячы гектараў грэчкі і 296 тысяч гектараў кукурузы. Сельскагаспадарчыя арганізацыі пасадзілі больш за 5 тысяч гектараў бульбы, гародніны — 0,6 тысячы гектараў. Для захавання ўраджаю ў рэгіёнах праводзяць хімічную праполку і фунгіцыдную апрацоўку пасеваў.

«Чакаем лепшы ўраджай, чым летась. Гатоўнасць па тэхніцы будзе яшчэ павялічвацца. Мы пакуль толькі ў самым пачатку нялёгкага шляху. 1700 камбайнаў абавязкова павінны быць у страі. Плануем таксама адправіць у раёны дадаткова 45 новых камбайнаў. Безумоўна, яны дапамогуць нам уклініцца ва ўборку азімага ячменю. Новыя камбайны паступяць практычна ва ўсе раёны вобласці: іх атрымаюць тыя гаспадаркі, якія адчуваюць найбольшую патрэбу ў абнаўленні», — дапоўніў першы намеснік старшыні.

Пасяўная плошча азімых збожжавых на збожжа і зялёны корм пад ураджай 2025 года запланавана на плошчы 400 тысяч гектараў. Праектам рашэння Мінскага абласнога выканаўчага камітэта прадугледжаны меры, накіраваныя на забеспячэнне ўборкі збожжавых і зернебабовых культур, а таксама сяўбы азімых культур ураджаю 2025 года ў аптымальныя агратэхнічныя тэрміны.

«Згодна з даручэннем Прэзідэнта, просім раённыя выканаўчыя камітэты прыняць тэрміновыя рашэнні ў накіраванні кадраў на ўборачную кампанію. У цэлым, пытанні кадраў у нас прапрацаваны, таму што людзі працуюць з года ў год. Акрамя таго, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт таксама заўсёды ідзе нам насустрач і адпраўляе пэўную колькасць кадраў на ўборку», — зазначыў Васіль Сысоеў.

Паводле яго слоў, ужо нарыхтавана больш за сем цэнтнераў кармавых адзінак. «Мы плюсуем да мінулага года амаль дзве кармавых адзінкі. Калі браць у фізічным танажы, то амаль 500 тысяч тон сенажу пайшлі ў плюс да ўзроўню мінулага года. Мы маем намер гэтую лічбу захоўваць. Пачынаецца другі ўкос, ён таксама радуе, таму мы разлічваем, што ў гэтым годзе атрымаем добрыя вынікі. Укос сенажу ў сваю чаргу паўплывае на вытворчасць малака і, самае галоўнае, на яго захаванасць», — падкрэсліў суразмоўца.

Яшчэ адна важная культура — рапс. Яго будуць прыбіраць амаль 900 камбайнаў. А пасляўборачнай дапрацоўкай збожжа займецца больш за 470 зернеачышчальна-сушыльных комплексаў.

На Міншчыне вядзецца актыўная работа па будаўніцтве новых жывёлагадоўчых комплексаў. «Сёлета, згодна з Указам Прэзідэнта № 442, уводзіцца дзесяць жывёлагадоўчых комплексаў. Плануем, што яны будуць уведзены да новага года. Яшчэ 20 комплексаў — у працэсе будаўніцтва. Гэтую лічбу мы не маем намер зніжаць. Робім зачын і на наступны год. У цэлым, нам неабходна за найбліжэйшыя пяць гадоў пабудаваць каля 80 новых сучасных малочнатаварных комплексаў», — падсумаваў першы намеснік.

Акрамя пытанняў уборачнай кампаніі, на нарадзе Мінскага абласнога выканаўчага камітэта першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў прадставіў новага памочніка Прэзідэнта па Мінскай вобласці Аляксандра Кохана.

**Даніл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

Рэгіёны

# КРАЙ МУЗЕЯЎ І ФЕСТЫВАЛЯЎ



**Чэрвеньскі раён знакаміты сваімі гісторыка-культурнымі помнікамі: музеямі Станіслава Манюшкі і Хаіма Суціна. Ён — радзіма нашага знакамітага касманаўта Алега Навіцкага. Славіцца край і сваімі буйнымі прадпрыемствамі, сярод якіх рыбгас «Волма», КУП «Чэрвеньская друкарня» і іншыя. Але галоўнае багацце Чэрвеньшчыны — таленавітыя, працавітыя, мэтанакіраваныя людзі, якія ствараюць і прымнажаюць гонар раёна. Менавіта так лічыць намеснік старшыні Чэрвеньскага райвыканкама Лідзія ШЧАЦІНКА, з якой сустрэўся карэспандэнт «Звязды».**

***— Лідзія Аляксандраўна, у Чэрвеньскім раёне вы працуеце з 2016 года, у 2021-м прызначаны намеснікам старшыні райвыканкама па сацыяльнай сферы. Як за гэты час змяніліся райцэнтр і раён у цэлым?***

— Раён сапраўды змяніўся, прычым літаральна ўсе яго населеныя пункты. У самім Чэрвені быў адкрыты краязнаўчы музей, пабудаваны новы дзіцячы сад, вельмі неабходны райцэнтру, – гэтыя аб'екты ўведзены ў эксплуатацыю ў 2020 годзе. Мы тады прымалі абласныя «Дажынкі» і музей з новай экспазіцыяй стаў сапраўдным падарункам для жыхароў раёна.

Штогод рамонтныя работы вядуцца на многіх аб'ектах сацкультбыту, у прыватнасці ва ўстановах адукацыі і культуры раёна, у Цэнтральнай раённай бальніцы, ФАПах, амбулаторыях. Для работнікаў сістэмы аховы здароўя створаны добрыя ўмовы для працы.

Вялікі аб'ём работ выкананы па добраўпарадкаванні тэрыторыі населеных пунктаў. Асаблівую ўвагу ўдзялялі і ўдзяляем месцам пахаванняў загінулых у час Вялікай Айчыннай вайны: у Чэрвені, гарадскім пасёлку Смілавічы і іншых населеных пунктах. Адзначу, што гэтыя работы не спыняюцца, будуць працягвацца.

***— Як уплывае на жыццё раёна блізкасць да беларускай сталіцы?***

— Тое, што Чэрвень знаходзіцца зусім недалёка ад Мінска, мае свае плюсы і мінусы. Безумоўна, уладкавацца на работу ў сталіцы значна лягчэй, чым у раённым цэнтры. Таму Мінск і перацягвае працоўныя рукі. Асаблівая шкада развітвацца з маладымі спецыялістамі, якія адпрацавалі ў нас пэўны тэрмін і потым імкнуцца ў сталічны мегаполіс альбо ў іншыя вялікія гарады.

Але мы не сядзім склаўшы рукі. Напрыклад, павялічваем колькасць маладых людзей, якія ідуць у ВНУ па мэтавых накіраваннях. Нягледзячы на тое, што Мінск у прамым сэнсе слова забірае ў нас найлепшых работнікаў, будзем рабіць усё, каб замацаваць моладзь у Чэрвеньскім раёне.

***— А як у цэлым развіваецца эканоміка раёна?***

— Чэрвеньскі раён лічыцца сельскагаспадарчым. Што датычыцца прамысловых прадпрыемстваў, то найбуйнейшы з іх – УП «Нафтабітумны завод», на долю якога прыпадае 73 % ад агульнага аб'ёму прамысловай прадукцыі, што ствараецца ў раёне. Яшчэ адно вядомае прадпрыемства — ААТ «Смілавіцкая валюшна-лямцавая фабрыка». Прадукцыя — валёнкі, коўдры, падушкі — карыстаецца вялікім попытам у спажыўцоў. Можна сказаць, што фабрыка займае ўстойлівую нішу на рынку, у тым ліку і на сусветным. Ёсць у раёне вытворча-харчовы завод, які выраблае безалкагольныя напоі, мінеральныя і пітныя воды, пладовыя віны.

Рэалізоўваецца і вядомая дзяржаўная праграма «Адзін раён — адзін праект». Так, у Смілавічах наладжаны выпуск унікальных лекавых сродкаў, які ажыццяўляе фірма «Рабфарма». Хутка адбудзецца дапастаўка вытворчага абсталявання, і прадпрыемства пачне працаваць на ўсю моц. Адным словам, эканоміка раёна паступова развіваецца, ствараюцца новыя працоўныя месцы. Так, сёння на тэрыторыі Чэрвеньскага раёна зарэгістравана больш чым 300 юрыдычных асоб, з дапамогай якіх ідзе папаўненне бюджэту.

Што датычыцца сельскай гаспадаркі, то ў раёне дзейнічаюць 12 сельгаспрадпрыемстваў, без уліку фермерскіх гаспадарак. Сярод іх асобна адзначу ААТ «Рыбгас «Волма», што пастаўляе спажыўцам разнастайную рыбную прадукцыю, якая не залежваецца на прылаўках гандлёвых аб'ектаў. А цэх перапрацоўкі прадукцыі дае магчымасць вырабляць марожаную, вэнджаную рыбу і нават кансервы. Вялікім попытам карыстаецца і мясная прадукцыя ЗАТ «Турэц».

***— Наколькі актыўна мясцовыя жыхары бяруць удзел у грамадскім жыцці раёна?***

— Людзі даволі актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх грамадскіх мерапрыемствах. Трэба адзначыць, што ў культурнай дзейнасці мы зрабілі стаўку на доўгатэрміновыя праекты, напрыклад на правядзенне шматлікіх фестываляў. Так, вясновы фестываль «Велікодны перазвон» праводзіцца ўжо дзевяць гадоў. Спачатку гэта было мерапрыемства раённага маштабу, а потым мы вырашылі ісці далей: запрасілі ўзяць удзел у ім і суседнія раёны. Яны адгукнуліся з задавальненнем. Нават у ковідныя гады фестываль не спыніўся, а ладзіўся дыстанцыйна. Калі ў першыя гады ён доўжыўся адзін дзень, то цяпер — тры. Яго канцэртныя праграмы заўсёды карыстаюцца вялікай цікавасцю ў гледачоў. Другі наш вядомы фестываль, «Калядная зорка», праходзіць пасля навагодніх свят.

***— У нейкім сэнсе Чэрвень можна назваць фестывальнай сталіцай Міншчыны, згодны?***

— Можа, гэта і гучна сказана, але адзначу, што не толькі Чэрвень, але і Смілавічы прымаюць шматлікіх удзельнікаў і гасцей фестываляў. Гэта шматканфесіянальны населены пункт. Там жывуць праваслаўныя, каталікі, мусульмане. Таму ў нас узнікла ідэя праводзіць там фестываль нацыянальных культур. І станоўчы водгук знайшлі не толькі сярод работнікаў культуры, але і ў насельніцтва.

Мы прымеркавалі яго да Дня незалежнасці, запрасілі прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, у першую чаргу з Мінска. Фестываль атрымаўся даволі разнастайны: акрамя канцэртнай праграмы ладзіцца конкурс нацыянальных падворкаў, святочнае шэсце. Адным словам, атрымалася яркае, насычанае і вельмі прыгожае відовішча, якое адразу завявала сэрцы мясцовых жыхароў і гасцей.

У мінулым годзе ў нас атрымалася рэалізаваць яшчэ адзін цікавы праект — правесці фестываль самадзейных калектываў, аб'яднаных сувяззю сваяцтва. І першым удзельнікам гэтага мерапрыемства стаў калектыў «Шасціснопскія сваякі» (па назве населенага пункта). Арганізатары пачалі шукаць падобныя калектывы па ўсёй краіне. І калі знайшлі, то запрасілі іх у мінулым годзе прыехаць да нас. Адгукнуліся чатыры калектывы з трох рэгіёнаў Беларусі, хоць, па даведках, іх налічваецца больш за дзесятак. Таму працягнем развіваць праект. Гэта наша своеасаблівая разыначка, якой мы ганарымся.

На заканчэнне дадам, што, безумоўна, усе добрыя традыцыі, закладзеныя ў апошнія гады на Чэрвеньшчыне, будзем зберагаць і развіваць.

**Сяргей РУЧАНАЎ.**
**Фота з архіва Чэрвеньскага райвыканкама.**

# ПРАВА НА КАПІТАЛЬНЫ РАМОНТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як расказаў **начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй МАЦЮХОЎ,** капітальны рамонт жыллёвага фонду ажыццяўляецца згодна з падпраграмай «Рамонт жылля» дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе 2021—2025», у адпаведнасці з якой неабходна штогод капітальна рамантаваць 3 % ад жыллёвага фонду, які эксплуатуецца.

— Трэба адзначыць, што летась дасягнуты самы высокі ўзровень рэалізацыі задачы: уведзена ў эксплуатацыю пасля капітальнага рамонту 3,4 мільёна кв. м, што склала 2,9 % ад жыллёвага фонду, — адзначыў прадстаўнік міністэрства.

Сёлета ў краіне плануецца ўвесці пасля капрамонту 3,6 мільёна кв. м жылля. Па выніках работы за студзень — май ужо ўведзена 428,1 тысяч кв. м, што складае 11,7 % ад гадавога задання. Вядуцца работы на аб'ектах капітальнага рамонту агульнай плошчай 2,2 мільёна кв. м. Па выніках работы ў першым паўгоддзі чакаецца ўвод у эксплуатацыю каля 1 мільёна кв. м.

## Комплексны падыход

У сёлетнім плане капітальнага рамонту ў сталіцы 208 жылых дамоў (а гэта 1 мільён 80 кв. м). Як паведаміў **першы намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Вячаслаў БАТУРА,** на сёння работы вядуцца амаль на ўсіх аб'ектах. У ролі падрадчыкаў у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам летась і сёлета выступаюць дзяржаўныя арганізацыі. Ужо ўведзена пасля капітальнага рамонту 98 тысяч кв. м. За першае паўгоддзе плануецца здаць 257,4 тысячы кв. м, і гэта будзе зроблена, бо па шэрагу аб'ектаў завершаны будаўнічамантажныя работы, і яны знаходзяцца ў стадыі здачы.

— З мінулага года мы выкарыстоўваем комплексны падыход у правядзенні капітальнага рамонту — адначасова кварталаў ці забудовы жылых дамоў. На капітальны рамонт ставіцца некалькі блізка размешчаных дамоў, што дазволіла скараціць скаргі



ад насельніцтва і транспартныя расходы, а таксама комплексна добраўпарадкаваць дваровую тэрыторыю пасля заканчэння рамонтных работ. На сёння ў Мінску пад комплексны падыход трапляе каля 700 тысяч кв. м, гэта каля 150 жылых дамоў, — расказаў Вячаслаў Батура, падкрэсліўшы, што падставай для пастаноўкі дома на капітальны рамонт з'яўляецца яго тэхнічны стан.

Сёлета ў сталіцы рамантуецца шэраг дамоў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць, большасць з іх размешчана на праспекце Незалежнасці, а таксама на вуліцы Камуністычнай. Тут шмат сваіх нюансаў.

— Калі летась быў адзін аб'ект гісторыка-культурнай каштоўнасці, то сёлета іх — 10. Яны знаходзяцца на кантролі ў Міністэрстве культуры. Работы даражэйшыя, бо там прымяняюцца рэстаўрацыйныя расцэнкі, спецыяльныя матэрыялы, якія могуць выкарыстоўвацца на такіх жылых дамах. Да падаражання вядуць работы на фасадзе, балконах, часткова — па даху. У прыватнасці, работы на фасадзе ў параўнанні са звычайным домам даражэйшыя ў 2-2,5 раза, — патлумачыў Вячаслаў Батура.

## Прэтэнзіі да жыльцоў і ад жыльцоў

Нярэдка абцяжарваюць і падаўжаюць выкананне работ самі жыльцы, у прыватнасці, тым, што адмаўляюцца даць доступ у кватэры.

— Шмат пытанняў па доступе, калі жыльцы зрабілі рамонты, пазашывалі нішы, аднак пры капрамонце камунікацыі трэба памяняць у адпаведнасці з праектам. Калі часткова работы не будуць выкананы, аб'ект не будзе ва ўстаноўленым парадку ўведзены ў эксплуатацыю. Прыходзіцца звяртацца ў суд па атрыманне доступу на выкананне работ па замене інжынерных камунікацый. Каб пазбегнуць такіх сітуацый, стараемся з грамадзянамі акрамя сходаў дадаткова кантактаваць і даваць тлумачэнні ў вайбер-чатах. Іх абавязаны згодна з дагаворам заводзіць падрадныя арганізацыі па кожным доме. Там жыльцы задаюць пытанні, адразу атрымліваюць адказ ад падрадчыка, ЖКГ, што скарачае непатрэбную папяровую перапіску, — адзначыў Вячаслаў Батура.

Аднак нярэдкія прэтэнзіі і ад жыльцоў да выканаўцаў капітальнага рамонту. Яны датычацца і пераліку работ: тут жыльцам часта не падабаецца, што цяпер не мяняюць вокны ў кватэрах, не робяць рамонт пад'езда і г. д., як гэта было раней. Але трэба ўсвядамляць, што спіс работ рэгламентаваны і з ім можна азнаёміцца загадзя. У ходзе капітальнага рамонту спецыялісты поўнасцю мяняюць дах, рамантуюць і афарбоўваюць фасад, у месцах агульнага карыстання ўсталёўваюць новыя вокны, электрашчыткі з заменай аўтаматаў, святлодыёдныя свяцільнікі, мяняюць электраправодку. У кватэрах выконваюць замену стаякоў халоднага і гарачага водазабеспячэння, водаадвядзення. Гэтак жа прэтэнзіі часта ўзнікаюць і да якасці саміх работ.

— Нашымі спецыялістамі выяўляецца да 10 тысяч дэфектаў за год на аб'ектах капітальнага рамонту. Лічба здаецца вялікай, але насамрэч улічваецца кожная трэшчына, адслаенне, няроўнасць. Што датычыцца структуры дэфектаў, то большая частка звязана з арганізацыяй будаўнічых і рамонтных работ. Падрадчык павінен арганізаваць кантроль якасці, і большасць недахопаў звязана якраз з парушэннем вытворчага кантролю якасці. Гэта або недастатковая колькасць вымяральных інструментаў, або ўвогуле адсутнасць кантролю з запісам у адпаведных журналах. З відаў работ большая частка дэфектаў — запаўненне аконных і дзвярных праёмаў і ажыццяўленне аўтарскага і тэхнічнага нагляду, — расказаў **намеснік начальніка інспекцыі Дэпартамента кантролю якасці і нагляду за будаўніцтвам па г. Мінску Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Павел ДРАЗДОЎ.**

## Чаму тэрміны зацягваюцца?

Інспекцыя кантралюе і аб'екты звышнарматыўнага будаўніцтва — тыя, на якіх капітальны рамонт занадта зацягнуўся.

— Бываюць месяцы, калі такіх аб'ектаў 10 %. Аднак удзельнікі будаўніцтва, заказчыкі, падрадчыкі прымаюць меры, і працэнт зніжаецца. Напрыклад, на пачатак мая было 38 аб'ектаў звышнарматыўнага будаўніцтва, на канец мая іх 35, на сёння — 30, — прыводзіць лічбы Павел Драздоў.

Аднак ёсць аб'екты, рамонт на якіх вядзецца непрыстойна доўга — з 2019—2020 гадоў. Іх у Мінску пяць. Як правіла, гэта дамы з доўгай, цяжкай гісторыяй будаўніцтва, у большасці выпадкаў на іх працавалі некампетэнтныя падрадчыкі, дзесьці патрабавалася карэкціроўка праектнай дакументацыі.

— На аб'ектах, дзе капітальны рамонт пачынаўся ў 2019—2020 гадах, як правіла, зніклі ці абанкруціліся падрадныя арганізацыі, пры гэтым недавыканалі работы. Давodзілася карэкціраваць праектную дакументацыю, шукаць іншыя падрадныя арганізацыі, кампенсаваць тыя грошы, якія былі патрачаны. Былі і судовыя разборы. Стаіць задача да 1 ліпеня разабрацца са старымі аб'ектамі і ўвесці іх у эксплуатацыю. У пяці дамах дарабляюцца работы, якія былі не завершаны нядобрасумленным падрадчыкам, — патлумачыў Вячаслаў Батура.

Ёсць і аб'ектыўныя прычыны, па якіх капітальны рамонт можа зацягнуцца.

— Агульная праблема — не зусім якаснае перадпраектнае абследаванне. Дом абследуе праектная ці спецыялізаваная арганізацыя, вызначае дэфекты, закладвае іх у праект. І часта падчас вытворчасці работ пры ўскрыцці канструкцый аказваецца, што стан дома крыху не такі ці зусім не такі. Адпаведна неабходна дадатковае абследаванне, карэкціроўка праекта, як правіла, з праходжаннем экспертызы і перазацвярджэннем праекта. І гэта расцягвае тэрміны прыёмкі. Частка пытанняў са «звышнарматыўкай» звязана з гэтым, — дадаў Павел Драздоў, адзначыўшы, што ёсць і станоўчыя прыклады. Сярод іх — самы вялікі дом у сталіцы па адрасе Адзінцова 36, корпус 1, які мае 25 пад'ездаў. Ён быў здадзены ў межах нарматыўнага тэрміну, бо там было добрае праектнае абследаванне і адпаведна арганізавана выкананне работ.

Шмат пытанняў узнікае ў жыхароў дамоў таварыстваў уласнікаў. Згодна са зменамі ў заканадаўстве, з гэтага года сродкі на капрамонт яны абавязаны пералічваць на спецыяльныя рахункі. Як жа іх будуць уключаць у праграмы капітальнага рамонту?

— Дамы таварыства ўласнікаў нічым не адрозніваецца ад іншых жылых дамоў. Крытэрыем пастаноўкі такіх дамоў, якія знаходзяцца на самаабслугоўванні, як і астатніх жылых дамоў, з'яўляецца неабходнасць, іх тэхнічны стан. Калі будынак мае патрэбу, ён будзе ўключаны ў перспектыўную праграму капітальнага рамонту. Гэтыя функцыі ўскладзены на мясцовыя распарадчыя органы. Напрыклад, у Фрунзенскім раёне пры распрацоўцы праекта на капітальны рамонт жылыя дамы былі ў кіраванні ЖКГ, але выбралі іншую форму ўласнасці — у пачатку года сталі таварыствамі ўласнікаў. Нягледзячы на гэта, яны пастаўлены на капітальны рамонт, — адзначыў Вячаслаў Батура.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Ядзерныя дзяржавы працягваюць мадэрнізаваць свае арсеналы



Ядзерныя дзяржавы па меры пагаршэння геапалітычнага становішча ўсё больш развіваюць свае арсеналы. Пра гэта гаворыцца ў дакладзе Стакгольмскага міжнароднага інстытута даследавання праблем міру (SIPRI), паведаміла ТАСС. «Дзевяць дзяржаў, якія валодаюць ядзернай зброяй, — ЗША, Расія, Вялікабрытанія, Францыя, КНР, Індыя, Пакістан, КНДР і Ізраіль — працягнулі мадэрнізацыю сваіх ядзерных арсеналаў, у 2023 годзе некаторыя з іх разгарнулі новыя ядзерныя ўзбраенні або сістэмы, якія здольныя несці ядзерны зарад», — адзначаецца ў тэксце. На студзень 2024 года ў свеце налічвалася прыкладна 12 121 боегалоўка, 9585 з якіх былі ў стане боегатоўнасці. Згодна з дакладам, 3904 з іх былі размешчаны на ракетах або самалётах, што на 60 працэнтаў перавышае ацэнкі за студзень папярэдняга года. Індыя, Пакістан і КНДР імкнуцца дасягнуць спосабу размяшчаць некалькі боегаловак на балістычных ракетах. Такія магчымасці ўжо маюць Вялікабрытанія, КНР, Расія, ЗША і Францыя.

## Лідары ЕС не дасягнулі пагаднення аб перапрызначэнні Урсулы фон дэр Ляен кіраўніком Еўракамісіі



Кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў Еўрапейскага саюза не дасягнулі пагаднення аб перапрызначэнні Урсулы фон дэр Ляен на пасаду старшыні Еўракамісіі (ЕК). Пра гэта паведаміў кіраўнік Еўрасавета Шарль Мішэль па выніках нефармальнай сустрэчы лідараў 27 краін супольнасці, паведаміла ТАСС. Паводле яго слоў, пытанне аб прызначэнні кіраўнікоў Еўракамісіі, Еўрасавета і знешнепалітычнай службы ЕС будзе вырашана да канца гэтага месяца. Чакаецца, што пытанне прызначэння на пасады кіраўнікоў еўрапейскіх інстытутаў будзе ў цэнтры ўвагі саміту ЕС 27—28 чэрвеня ў Брусэлі. Цяперашняя нефармальная сустрэча лідараў краін Еўрапейскага саюза была прысвечана абмеркаванню стратэгічнага парадку дня аб'яднання на найбліжэйшыя пяць гадоў. Найбольш вострым на гэты момант з'яўляецца пытанне аб прызначэнні будучага кіраўніка Еўракамісіі. На пасаду жадае пераабрацца фон дэр Ляен, яе партыя перамагла на выбарах у Еўрапарламент. Пры гэтым некаторыя краіны ЕС прапануюць свае кандыдатуры.

## Маск заявіў, што ў будучыні ў людзей замест тэлефонаў будуць мазгавыя імпланты



«А вы б устанавілі сабе ў мозг інтэрфейс Neuralink, які б дазволіў вам кіраваць сваім новым тэлефонам X сілай думкі?» — пацікавіўся ў карыстальнікаў сацсеткі аўтар парадыйнага акаўнта Not Elon Musk. У сваю чаргу сам Маск пракаментаваў пост, заявіўшы, што ў будучыні мабільныя дэвайсы зусім не спатрэбяцца. «У будучыні не будзе тэлефонаў, будзе толькі Neuralink», — адказаў ён у каментарыі. Аб гэтым паведаміла РІА «Новости». У студзені Маск паведаміў, што першы чалавек атрымаў імплант кампаніі Neuralink і адчувае сябе добра. Тады бізнесмен адзначаў, што першыя атрыманыя даныя аб рабоце прылады паказваюць шматабяцаючыя вынікі. У сакавіку першы пацыент з імплантам паказаў, як гуляе ў шахматы «сілай думкі». Тады ж Маск анансаваў мазгавы імплант кампаніі Neuralink, які задумваецца як прылада, што дазваляе бачыць сляпым людзям. Наступны праект называецца Blindsight.

# Ставім на цёплае лета

## Якой была вясна?

А яна заняла 2-е месца ў шэрагу назіранняў ад самай цёплай да самай халоднай з 1881 года, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Сярэдняя тэмпература паветра вясновага сезона склала плюс 9,7 градуса, што на 2,4 градуса вышэй за кліматычную норму. Па ўсёй тэрыторыі краіны адзначалася станоўчая анамалія сезоннай тэмпературы паветра, якая знаходзілася ў межах ад плюс 1,8 да плюс 3 градусаў. Найбольшыя станоўчыя адхіленні тэмпературы паветра ад кліматычнай нормы былі адзначаны на тэрыторыі Гродзенскай вобласці (у сярэднім па вобласці плюс 2,6 градуса), найменшыя — на тэрыторыі Гомельскай вобласці (у сярэднім па вобласці плюс 2 градусы). Тэмпература ўсіх трох месяцаў сезона была вышэйшая за норму.

У сакавіку тэмпература паветра склала плюс 4,1 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 3,3 градуса. Сакавік бягучага года заняў 5-е месца па цяпле пачынаючы з 1945 года. Максімальная тэмпература паветра за месяц адзначана на станцыі Лельчыцы 31 сакавіка і склала плюс 27,2 градуса. У сакавіку 2024 года па ўсёй тэрыторыі краіны былі абноўлены значэнні абсалютнага максімуму тэмпературы паветра, перавысіўшы папярэднія на 2—5 градусаў. Мінімальная тэмпература паветра за месяц зарэгістравана на станцыі Бабруйск 11 сакавіка і склала мінус 9,3 градуса.

Устойлівы пераход сярэдняй сутачнай тэмпературы паветра праз 5 градусаў у бок павышэння (пачатак перыяду вегетацыі) на большай частцы тэрыторыі краіны ажыццявіўся на 1,5—2 тыдні раней за свае звычайныя тэрміны — 21—29 сакавіка, на крайнім паўднёвым усходзе — 17 сакавіка, а на крайнім паўднёвым захадзе пераход адбыўся яшчэ 21—22 лютага, што раней за звычайныя тэрміны на месяц і больш.

Паводле інфармацыі кліматолагаў, сярэдняя па Беларусі тэмпература паветра за красавік склала плюс 10,1 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 2,3 градуса. Красавік бягучага года заняў 3-е «цёплае» месца. Максімальная тэмпература паветра за месяц адзначана на станцыі Жыткавічы 2 красавіка і склала плюс 28,2 градуса. На станцыі Езярышча былі абноўлены гістарычныя месячныя максімум тэмпературы паветра. Мінімальная тэмпература паветра за месяц зарэгістравана на станцыі Бабруйск 5 красавіка і склала мінус 2,7 градуса.

Устойлівы пераход сярэдняй сутачнай тэмпературы паветра праз 10 градусаў у бок павышэння (перыяд актыўнай вегетацыі) на большай частцы тэрыторыі краіны ажыццявіўся 26—28 красавіка, у тэрміны, блізкія да звычайных. На крайнім поўдні, паўднёвым усходзе і ўсходзе краіны пераход адбыўся на 2—3 тыдні раней за звычайныя тэрміны.

Сярэдняя па краіне тэмпература паветра за май сёлета склала плюс 14,9 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 1,5 градуса. Май бягучага года заняў 12-е месца ў ранжыраваным шэрагу назіранняў ад самага цёплага да самага халоднага. Максімальная значэння тэмпература паветра дасягнула 26 мая на станцыі Езярышча (абноўлены гістарычны месячны максімум тэмпературы паветра) і склала плюс 31,3 градуса. Мінімальная тэмпература паветра адзначана на станцыі Верхнядзвінск 9 мая і склала мінус 4,6 градуса. Устойлівы пераход сярэдняй сутачнай тэмпературы паветра праз 15 градусаў у бок павышэння на большай частцы тэрыторыі краіны ажыццявіўся 16—18 мая, на 1—2 тыдні раней за свае звычайныя тэрміны, а па большай частцы Віцебскай вобласці — раней за звычайныя тэрміны на 2 дэкады.

За вясну ў сярэднім па краіне выпала 132 міліметры ападкаў, што складае 95 % кліматычнай нормы за сезон. На большай частцы тэрыторыі краіны выпала 70—100 % нормы ападкаў. Кліматолагі канстатавалі, што на працягу вясны на тэрыторыі Беларусі ападкі выпадалі нераўнамерна. За першы месяц сезона ў сярэднім па краіне выпала 22 міліметры ападкаў, што склала 59 % кліматычнай нормы. Сакавік 2024 года ўвайшоў у дваццатку самых засушлівых пачынаючы з 1945 года.

Залішняе ўвільгатненне назіралася ў красавіку, калі за месяц у сярэднім выпала 85 міліметраў ападкаў, што склала 218 % кліматычнай нормы. Красавік 2024 года заняў другое месца ў ранжыраваным шэрагу назіранняў ад самага вільготнага да самага сухога. На асобных пунктах назірання па тэрыторыі Віцебскай, Мінскай і Гомельскай абласцей былі абноўлены гістарычныя месячныя і сутачныя максімумы сум ападкаў.

Май практычна быў сухі — выпала 25 міліметраў, або 40 % ад нормы. Апошні месяц вясны 2024 года заняў другое месца ў ранжыраваным шэрагу назіранняў ад самага сухога да самага вільготнага. На станцыі Брэст быў абноўлены гістарычны месячны мінімум сум ападкаў.

На працягу вясны адзначаліся галалёдныя з'явы, туманы, навальніцы, выпадзенне граду, месцамі дасягнула крытэрыю небяспечнай гідраметэаралагічнай з'явы. 20 мая на ГП Навасёлкі (Брэсцкая вобласць) быў адзначаны град дыяметрам 20 міліметраў.

## Прагнозы метэацэнтраў і папулярных сіноптыкаў

Дарэчы, шэраг рэсурсаў, якія сочаць за нябеснай канцылярыяй, прагназуюць гэтае лета амаль як самае спякотнае за апошні час. Напрыклад, у чэрвені ў сярэднім абяцаюць да 20 градусаў, у ліпені — ад 21 да 25 градусаў, а ў жніўні — ад 23 да 26 градусаў.

Прычым у першы месяц лета чакалася толькі 8 ясных дзён і 15 сутак з працяглымі ападкамі. А ліпень павінен падарыць беларусам 10 гарачых дзён і 14 дажджлівых. У жніўні пагодлівых дзён будзе значна больш — цэлых 14, а ападкаў — у 2 разы менш (дажджы магчымыя толькі 7 разоў за месяц). Але гэта папярэдні прагноз. Ці апраўдаюцца прадказанні «доўгатэрміновых» сіноптыкаў, пачакаем.

Апошнім часам у нас вельмі папулярныя «тэлевізійныя сіноптыкі». На іх думку, у якасці адной з галоўных характарыстык лета названа зменлівасць умоў надвор'я. Магутныя працяглыя хвалі цяпла будуць змяняцца інтэнсіўнымі працяглымі пахаладаннямі.

Прычым змене ўмоў надвор'я будуць спадарожнічаць моцныя ліўні, навальніцы, шквалы ветру і град. Вынік працяглых ападкаў — пераўвільгатненне глебы, дэфіцыт цяпла і дажджавыя паводкі. А ад хваляў цяпла можна чакаць сухавей, засуху і прыродныя пажары.

Колькасць ападкаў мяркуецца каля кліматычнай нормы. На працягу лета нас чакае ў сярэднім ад 24 да 32 вільготных дзён, вяшчаюць тэлесіноптыкі.

## Як спякотна было летась

У Белгідрамецэ адзначаюць, што летась з 360 дзён 140 былі «аранжавымі» па ўзроўні небяспекі. Пра што МНС папярэджвала беларусаў шляхам СМС-абвесткі.

У цэлым жа мінулы год у Беларусі быў цёплым, але пабіць цеплавыя рэкорды не ўдалося. Сярэднегадавая тэмпература склала плюс 8,7 градуса, у летні перыяд — 18 цяпла. Леташні май быў самым засушлівым месяцам, чаго не скажаш пра сёлетні. Максімальна высокая тэмпература была зафіксавана 6 жніўня 2023 года на станцыі Лельчыцы, калі слупок тэрмометра паказаў плюс 34,5 градуса. Такім чынам, мінулы год заняў 3-е месца сярод самых цёплых і 11-е месца сярод самых вільготных.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Найбольш халодным было лета 1928 года, калі сярэдняя тэмпература паветра з чэрвеня да жніўня склала плюс 14,6 градуса. А самым гарачым стала лета 2010 года з сярэдняй тэмпературай 20,6 цяпла.

Самы гарачы ліпень у нашай краіне з перавышэннем кліматычнай нормы на 3,7 градуса ўвайшоў у гісторыю метэаназіранняў у 2010-м: тады сіноптыкі адзначылі сярэднюю тэмпературу месяца 22,6 градуса.

Тэмпературны максімум ліпеня пакуль не ўдаецца пабіць яшчэ з даваенных часоў: у 1936 годзе на станцыі Лельчыцы (29 чысла) і ў Гомелі (30 чысла) зафіксавалі 37,9 градуса. Самы дажджлівы ліпень быў у 2000 годзе, калі выпала 161 міліметр ападкаў — гэта 180 % кліматычнай нормы.

Самым гарачым жнівень стаў у 2010-м, калі сярэдняя тэмпература склала 20,8 градуса. Халодным гэты месяц быў у 1987 годзе, тады слупкі тэрмометраў у сярэднім паказалі па краіне 14,3. Тэмпературны рэкорд 8 жніўня зафіксаваны ў 2010-м у Гомелі — 38,9 градуса. Дарэчы, гэтая лічба з'яўляецца абсалютным максімумам за ўвесь час метэаралагічных назіранняў у Беларусі. А самым мокрым жнівень быў у 2006-м, калі выпала ў сярэднім амаль 300 % кліматычнай нормы ападкаў.

## Што кажуць кліматолагі?

Сваім меркаваннем падзяліўся **акадэмік НАН Беларусі Уладзімір ЛОГІНАЎ**. «Ёсць падставы чакаць далейшае павышэнне тэмпературы ў Беларусі і на планеце ў цэлым, — разважае кліматолаг. — Але цяперашняе лета не стане такім анамальна гарачым, як, напрыклад, у 2010 годзе. Апошнія ж пяць гадоў летам градус расце павольней. Адназначна сказаць, з чым гэта звязана, немагчыма, але не апошнюю ролю ў гэтым адыграла антрапагеннае ўздзеянне».

У пачатку стагоддзя сярэднегадавыя выкіды парніковых газаў складалі 500 мільёнаў тон, цяпер — каля 60 мільярдаў. Калі аб'ёмы выкідаў застануцца такімі ж, то да канца стагоддзя ў Беларусі летам тэмпература вырасце на 1—1,5 градуса, а зімой — на 2—4 градусы. Ужо праз 30 гадоў клімат на поўначы Беларусі стане прыблізна такім, як цяпер на поўдні.

Уладзімір Логінаў удакладняе, што ападкі ўсё часцей выпадаюць нераўнамерна. У апошнія трыццацігоддзе іх колькасць скарацілася прыблізна на 5—10 працэнтаў у чэрвені і жніўні, але настолькі ж вырасла ў ліпені.

Што прынцыпова важна — стала больш ліўняў. А гэта нядобра для сельскагаспадарчых угоддзяў: вада збягае ў водапрыёмнікі, не паспеўшы як след увільгатніць глебу. Колькасць спрыяльных для ўраджаю ападкаў, на жаль, не расце.

Уладзімір Логінаў пракаментаваў з'яўленне віхру ў Фаніпалі, які карыстальнікі інтэрнэт-сеткі імгненнем ахрысцілі смерчам. «Па сутнасці, смерч — гэта прарыў халоднага паветра з высокіх слаёў на вельмі цёплую падсцілальную паверхню. І чым падсцілальная паверхня цяплейшая, тым верагоднасць узнікнення смерчу вышэйшая. У апошнія гады часцей адбываецца дысбаланс велічынь выпарэння і ападкаў».

## Трэба быць гатовымі да катаклізмаў

Як адзначыў **загадчык лабараторыі біягеаграфіі Інстытута геаграфіі РАН Аркадзь ЦІШКОЎ**, з-за пацяплення змяняецца цыкл атмасфернай цыркуляцыі, а разам з ім і характар выпадзення ападкаў. Кліматычная сістэма Зямлі адзіная, у яе ўцягнуты ўсе працэсы цыркуляцыі атмасферы і акіяна. І калі дзесьці выпала шмат ападкаў, значыць, у іншым месцы лютуюць спякота і засуха.

Сапраўды, анамальных ападкаў (у Расіі, а таксама ў нас у краіне) з-за змены атмасфернай цыркуляцыі стала больш. Мінулай зімой мы былі сведкамі анамальных снегападаў, вясной — магутных паводак. З прыходам лета настаў час ліўняў. Магчыма, на змену антыцыклянічнаму надвор'ю прыходзіць цыкланічнае з вялікім аб'ёмам пераносу вільготных мас.

Да небяспечных з'яў надвор'я трэба быць гатовымі: будаваць трывалыя хаты, у гарадах фарміраваць магутныя, з запасам, сістэмы сцёку ліўневых вод і сачыць за іх станам, на рэках і ў горных далінах узводзіць моцныя масты з улікам расходу вады, які магчымы раз на сто гадоў, не засяляць пойму і іншыя.

Аркадзь Цішкоў заяўляе, што кліматычная сістэма Зямлі жыве сваім жыццём тысячагоддзямі, паўтараючыся ў іншых праявах, што дазваляе выкарыстоўваць для прагнозу і народныя прыкметы, і навуковыя распрацоўкі.

У небяспечных з'яў надвор'я ёсць пэўная цыклічнасць. Напрыклад, у 1920—1930-х гадах у еўрапейскай частцы Расіі часта здараліся засухі і, такім чынам, неўраджаі і голад. Гэта быў папярэдні цыкл так званага пацяплення. Цяпер, на вылеце новага цыкла, усё паўтараецца. Паўднёвыя чарназёмныя рэгіёны ўсё часцей адчуваюць засуху. А дзе здараюцца засухі, там адбываюцца і пыльныя буры, і смерчы, і наступныя за імі катастрафічныя ліўні з градам.

«Лічу, што клімат на планеце ў цэлым цыклічны. Гэта адлюстравана ў летапісах, дзе таксама згадваюцца анамальныя засухі, ападкі, пахаладанні. Яны адбіваліся на ўраджаях, голадзе, хваробах. Іх паўтаральнасць у храналогіях вельмі наглядная».

Рускія летапісы ўтрымліваюць шмат інфармацыі аб перыядах анамальна гарачых летніх месяцаў у сярэдняй паласе, аб нашэсцях саранчы.

## Сёлета планета ўпершыню перасягне небяспечную мяжу цеплыні

Даследчыкі прагназуюць, што ў гэтым годзе клімат планеты ўпершыню выйдзе за межы пацяплення ў 1,5 градуса. Навукоўцы ўпэўнены, што кліматычны крызіс не наступіць адразу ж пасля «першага кантакту». Большасць кліматычных пераломных момантаў, якія могуць прывесці да таго, што кліматычная сістэма Зямлі папросту выйдзе з ладу, як мяркуюць навукоўцы, не чакаюцца да таго часу, пакуль на планеце не стане стабільна цяплей на 1,5 градуса, чым у даіндустрыяльны перыяд.

Добрыя навіны заключаюцца ў тым, што сярэдняя глабальная тэмпература планеты, верагодна, знізіцца, як толькі цяперашняе цячэнне Эль-Ніньё, якое пануе ў Ціхім акіяне і ўплывае на клімат планеты ў цэлым, знікне. Аднак навукоўцы папярэджваюць, што 2024-ы можа стаць першым годам, калі планета ўпершыню дасягне мяжы ў 1,5 градуса.

Планета няўмольна награваецца, і гэта датычыцца не толькі сушы, але і акіянаў: яны літаральна закіпаюць, як і ўсё жывое ў іх. У зоне рызыкі — трапічныя каралавыя рыфы, якія, як лічыцца, утрымліваюць больш відаў, чым любая іншая экасістэма планеты.

Па словах біёлагаў, каралы прыстасаваліся жыць у пэўным тэмпературным дыяпазоне, а таму занадта высокія тэмпературы на працягу доўгага перыяду часу могуць страціць іх колер. У канчатковым выніку каралавыя рыфы могуць папросту памерці.

Прагнозы навукоўцаў сведчаць аб тым, што дасягненне тэмпературнага парога прывядзе да гібелі 99 % рыфаў — гэтыя экасістэмы будуць падвяргацца ўздзеянню невыноснай спякоты. Іншыя даследаванні таксама прагназуюць, што дасягненне парога ў 1,5 градуса паставіць пад пагрозу існавання 15 % усіх відаў, якія жывуць у акіяне. Калі мы пераадолеем мяжу ў 2,5 градуса, колькасць пацярпелых відаў павялічыцца ўдвая.

Пры дасягненні больш магутнага павелічэння сярэдняй тэмпературы чалавецтва рызыкуе справакаваць хвалі цяпла настолькі інтэнсіўныя, што яны перасягнуць здольнасць чалавечага цела астуджацца. Простымі словамі — планета можа нагрэцца да такой ступені, што чалавечая фізіялогія папросту не вытрымае такіх тэмператур.

Навукоўцы адзначаюць, што ў розных рэгіёнах планеты пацяпленне адбываецца з рознай хуткасцю, а таму ў некаторых краінах гэты парог можа быць пераадолены хутчэй, чым у іншых.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Вогненныя вёскі. Нельга забыць**

**Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца**

# АПОШНЯЯ РАНІЦА

## 80 гадоў таму акупанты знішчылі Дальву

**Мікалай Гірыловіч, адзіны жыхар гэтай лагойскай вёскі, які выжыў, успамінаў: той дзень — 19 чэрвеня 1944 года — абяцаў быць сонечным, неба радавала блакітам. «Над хатамі курыўся дымок. Жанчыны з вёдрамі павольна ішлі да калодзежаў, дзеці яшчэ спалі. Ніхто з мясцовых жыхароў не ведаў, што для іх тая раніца стане апошняй, а дня не будзе...»**



Мікалай Гірыловіч на Могілках Вёсак у Хатыні.

Гэтую летнюю раніцу панядзелка, які пасля Мікалай Пятровіч называў чорным, да самага апошняга свайго дня ён памятаў да драбніц. Ды і як такое можна было забыць?! У адзін дзень страціць усё, што было... У 13 гадоў застацца круглым сіратой... Адзіны дальвінец, які цудам пазбег фашысцкай расправы, часта задаваўся пытаннем: чаму ён застаўся жывы, чаму не апынуўся побач са сваёй сям'ёй у тым кастрышчы? І сам жа знаходзіў адказ: «Гасподзь пакінуў мне жыццё, каб было каму расказаць...»

Усё сваё жыццё Мікалай Гірыловіч прысвяціў увекавечанню памяці роднай вёскі і яе жыхароў. Летам 1969 года, на адкрыцці мемарыяльнага комплексу ў Хатыні, ён цвёрда вырашыў: трагедыя Дальвы не павінна быць забыта.

### Вярнуліся за тры дні да трагедыі

На працягу доўгіх гадоў Мікалай Гірыловіч быў сябрам «Звязды». Пачынаючы з 1990-х гадоў наша газета з'яўлялася інфармацыйным партнёрам усіх работ, якія праводзіліся на мемарыяльным комплексе. У 2006 годзе Мікалай Пятровіч пайшоў з жыцця. Мы падтрымліваем адносіны з яго жонкай і дачкой, якія свята берагуць памяць аб сваім родным чалавеку і той справе, якой ён прысвяціў свой век.

Па традыцыі напярэдадні чарговай гадавіны трагедыі ў Дальве карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з Рымай Ігараўнай і Вольгай Мікалаеўнай. На працягу многіх гадоў дачка Мікалая Гірыловіча разам з сям'ёй жыве ў Аўстраліі, але на радзіме бывае часта. Практычна заўсёды яе прыезд выпадае на гадавіну дальвінскай трагедыі.

— З самага ранняга дзяцінства я ведала, якая бяда ў гады акупацыі здарылася з маімі блізкімі, — расказвае Вольга. — Спачатку мне было дзіўна, чаму ва ўсіх па дзве бабулі і два дзядулі, а ў мяне адна бабуля і адзін дзядуля па лініі маці, а ў бацькі нікога няма. Мы вельмі часта ездзілі з ім у Дальву. І грыбы там збіралі, і ягады. Я з гэтым вырасла. Раней больш спакойна ставілася да трагедыі. Цяпер, калі прыязджаю ў Дальву, у мяне нагортваюцца слёзы. Я не магу гаварыць пра гэта спакойна. З узростам больш востра ўспрымаеш тыя падзеі, вельмі спачуваеш, суперажываеш людзям, якія маглі быць дастойнымі грамадзянамі нашай дзяржавы.

Дальва лічылася невялікай вёскай — усяго 12 хат. Жылі ўсе дружна, сярод аднавяскоўцаў шмат было сваякоў. Таму не дзіва, што ніхто нікога не выдаваў, калі ў хатах начавалі партызаны. Мікалай разам з бацькам былі сувязнымі партызанскага атрада «Барацьба» брыгады «Народныя мсціўцы» імя Варанянскага. Маці пякла для партызанаў хлеб, нярэдка давала ім прытулак. Калі падчас вялікай карнай экспедыцыі 1944 года сховішча спатрэбілася дальвінцам, партызаны іх размясцілі ў сваім лагеры. У вёску жыхары вярнуліся за тры дні да трагедыі...


Мікалай Гірыловіч каля скульптуры «Маці з сынам» у Дальве.

### «Аднавяскоўцы ўжо дагаралі...»

19 чэрвеня 1944 года, усяго за некалькі дзён да вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у Дальве былі знішчаны 44 чалавекі: двое мужчын, 13 жанчын і 29 дзяцей. У тым жудасным вогнішчы загінулі мама, бацька, дзядуля і тры малодшыя браты Мікалая Гірыловіча. Трынаццацігадовы хлопчык цудам выжыў.

За некалькі гадзін да таго, як у вёску ўварваліся акупанты, маці адправіла сына падмяніць бацьку, які кіламетры за два ад населенага пункта пасвіў каня. Тады хлопчык яшчэ не ведаў, што гэты факт выратуе яму жыццё. Як толькі ў Дальве пачуліся выбух і выстралы, Коля Гірыловіч узяўся распутваць каня. Але жалезныя ланцугі не паддаваліся хлапчуковым рукам, і тады ён кінуўся ў бок вёскі, над якой ужо ўзнімаўся вялізны слуп дыму. Як ён сам пазней прызнаецца, калі б паскакаў на кані, то апынуўся б у Дальве акурат тады, калі акупанты жорстка распраўляліся з мірнымі жыхарамі — яго аднавяскоўцамі і самымі блізкімі людзьмі.

«Я прыбег агародамі, праз жыта — дзверы ў хаце адчынены, лётае пух ад падушак, шкло пабітае, а на стале раскладзены лыжкі, — успамінаў той страшны дзень Мікалай Гірыловіч. — Выбег з хаты — нікога навокал, толькі праз дым убачыў у канцы вёскі дзве крытыя машыны. Мусіць, думаю, забралі людзей. Але не, аднавяскоўцы ўжо дагаралі...»

Ён пазнаў маці па залатых зубах: у яе адзінай на ўсю вёску былі такія. Яна разам з адным з сыноў ляжала ў баку ад згарэлага дома: відаць, атрымалася вырвацца, але іх усё роўна напаткала варожая куля. Дзесяць дзён і начэй дальвінцы ляжалі пад адкрытым небам — ланцугі немцаў, якія адступалі, цягнуліся і цягнуліся праз ужо мёртвую вёску, не даючы магчымасці пахаваць нябожчыкаў. 29 чэрвеня, калі савецкія танкі былі побач, у Дальву прыйшлі жыхары навакольных вёсак, партызаны, людзей пахавалі ў брацкай магіле.

### «Мама яго ва ўсім падтрымлівала»

Мікалай Гірыловіч ніколі не быў шматслоўным, калі згадваў той жудасны дзень. Яго маўчанне цудоўна разумелі родныя, таму не задавалі лішніх пытанняў.

— Мы ўсе — дзеці вайны, і тая трагедыя, якая адбылася ў Дальве, фактычна была ўсюды, — кажа яго жонка, Рыма Ігараўна. — Наша хата стаяла на месцы цяперашняга завода «Белмедпрэпараты». Літаральна на другі дзень акупацыі Мінска яна згарэла, і мы (мама, бацька, я і брат) пераехалі ў раён Старажоўкі, да бабулі па матчынай лініі. Гэта была ўскраіна Мінска. Але калі людзей расстрэльвалі ў Трасцянцы, у Старажоўцы гул стаяў. Былі чуваць стогны людзей, іх крыкі. Мы прызвычаіліся да гэтага гора. Таму разумелі Мікалая, які насіў у сабе вялізны боль.

Дачка Вольга пацвярджае: бацька ўсё жыццё перажываў трагедыю Дальвы. «Мама яго ва ўсім падтрымлівала, — расказвае яна. — Усё, што трэба было, аддавалася для Дальвы. Атрымаюць заробак і адкладваюць, што пойдзе на будаўніцтва, а што — на прадукты...»

«Калі мы пажаніліся ў 1957 годзе, стала пытанне — упарадкаваць хаця б пахаванне, — дадае Рыма Ігараўна. — Першае, што мы з ім зрабілі, — устанавілі вялікую металічную агароджу. Быў пастаўлены абеліск, на якім пайменна пералічаны ўсе 44 загінулыя».

Затым у іх сям'і пачалася вялікая будоўля. Мемарыяльны комплекс у Дальве ўзводзіўся на ўласныя грошы і ахвяраванні неабыякавых людзей. «Значную дапамогу яму аказала Дзяржтэлерадыё (цяпер Белтэлерадыёкампанія), дзе ён на працягу 40 гадоў працаваў начальнікам апаратна-студыйнага комплексу, — удакладняе Рыма Гірыловіч. — Дзякуючы гэтай падтрымцы (рэгулярным суботнікам, дабрачынным канцэртам), будаваўся мемарыял. Усе грошы ішлі на будаўніцтва. Калі ён звяртаўся да дзяржаўных дзеячаў, яму аказвалі матэрыяльную і не толькі падтрымку. 15 ліпеня 1973 года мемарыяльны комплекс у Дальве адкрылі».


Дачка Мікалая Гірыловіча Вольга з партрэтам бацькі.

### Плюс яшчэ адзін чалавек

На месцы былой вёскі 44 бярозы — менавіта столькі людзей загінула ў той жудасны чэрвеньскі дзень. На месцы, дзе раней стаялі хаты, — зрубы з цэменту. На 16-метровай сцяне памяці — імёны загінулых дальвінцаў, двое дзяцей былі з суседніх населеных пунктаў. Гасцей, што прыязджаюць у мёртвую вёску, сустракае прыгожая жанчына, якая з застылымі вачамі глядзіць уперад, і маленькі хлопчык, які яе абдымае, самотна схіляючы галаву, — так скульптар увекавечыў маці Мікалая Гірыловіча і аднаго з яго братоў. Гледзячы на жаноцкую постаць, заўважаеш круглявы жывот — маці Гірыловіча чакала яшчэ адно дзіця. У тым жудасным полымі загінуў яшчэ адзін чалавек...

Мемарыяльны комплекс «Дальва» з'яўляецца філіялам Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Дзякуючы намаганням Мікалая Гірыловіча, у Дальву пракладзена дарога, праведзена электрычнасць і тэлефонная сувязь, устаноўлены і асвечаны праваслаўны крыж, працуе музей. Штогод напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Беларусі ў Дальве ладзіцца агітпрабег, у дзень трагедыі вёскі праводзіцца мітынг-рэквіем. Сёлета не стане выключэннем. Родныя і блізкія дальвінцаў па традыцыі ўшануюць памяць сваіх родных, імёны якіх увекавечаны ў мемарыяльным спісе, успомняць добрым словам чалавека, дзякуючы якому ў іх на працягу многіх гадоў ёсць такая магчымасць.

«Мікалай часта сустракаўся з немцамі, і яны ўвесь час у яго пыталіся: прабачыў ён ці не, — расказвае ў завяршэнні сустрэчы Рыма Гірыловіч. — Для іх гэта было вельмі важна. Ён нічога не адказваў на гэтае пытанне. Казаў толькі тое, што робіць усё для таго, каб больш такое не паўтарылася».

Аб тым, што падобная трагедыя больш ніколі не павінна адбыцца, у далёкай Аўстраліі сваім аднакласнікам расказваюць і праўнукі Мікалая Гірыловіча. Дзякуючы ім, аб трагедыі беларускай Дальвы ведаюць на іншым канцы свету.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота з архіва герояў публікацыі.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
19 чэрвеня 2024 г. № 23 (756)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

НАПЯРЭДАДНІ

# Сустрэнемся на форуме магчымасцяў




На наступным тыдні ў Віцебску, Полацку і Наваполацку адбудзецца XI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі

Фота Аляксандры ГВОЗДЗЕВАЙ.

**Упершыню мерапрыемства, арганізатарамі якога з'яўляюцца Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савет Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі, пройдзе на пляцоўках адразу трох гарадоў. Па-за дзелавым парадкам дня ва ўдзельнікаў і гасцей форуму з'явіцца магчымасць азнаёміцца са славутасцямі Беларусі. Іх, вядома, нямала ў найстаражытнейшым горадзе нашай краіны — Полацку, ёсць што паглядзець і ў Наваполацку, які з'яўляецца адным з самых маладых населеных пунктаў краіны. Цэнтр рэгіёна — культурны і прамысловы Віцебск — таксама можа здзівіць. І не толькі «Славянскім базарам».**

Тэма адзінаццатага Форуму рэгіёнаў — роля міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў пабудове інавацыйнай эканомікі Саюзнай дзяржавы. Арганізатары падрыхтавалі насычаную праграму. Удзельнікаў форуму чакаюць выставачныя і прэзентацыйныя мерапрыемствы, дзелавая праграма, не абыдзецца і без культурнай часткі. Кульмінацыяй традыцыйна стане падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве, камерцыйных кантрактаў і іншых дакументаў, накіраваных на пашырэнне двухбаковага супрацоўніцтва.

На пляцоўках форуму адбудзецца сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталлі Качанавай і Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Валянціны Матвіенка з кіраўнікамі органаў дзяржаўнай улады рэгіёнаў Беларусі і суб'ектаў Расіі. У рамках сустрэчы прадугледжана падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж урадам Беларусі і расійскімі суб'ектамі. Адбудзецца пленарнае пасяджэнне XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Акрамя таго, у плане дзелавой праграмы — сумеснае мерапрыемства гандлёва-прамысловых палат Беларусі і Расіі на тэму «Раскрыццё патэнцыялу інавацыйнага супрацоўніцтва Расіі і Беларусі — вектар тэхналагічнага развіцця і росту», спецыяльная панэльная сесія кантрольных ведамстваў дзвюх краін, сумеснае пасяджэнне кіруючых органаў Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Беларусі і Палаты маладых заканадаўцаў пры Савеце Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі.

Работа секцыйных пасяджэнняў адбудзецца на пляцоўках адразу трох гарадоў. Тэма першай секцыі — «Эфектыўная рэалізацыя заканадаўства як найважнейшы фактар саюзнай інтэграцыі» (пройдзе ў Полацкім дзяржаўным універсітэце імя Ефрасінні Полацкай у Полацку). Другая секцыя на тэму «Развіццё міжрэгіянальнага супрацоўніцтва як найважнейшы напрамак забеспячэння паступальнага развіцця Саюзнай дзяржавы» адбудзецца на базе ААТ «Белаграпрамбанк» у Полацку. Секцыю пад нумарам тры — «Інавацыйная медыцына і фармацыя ў Саюзнай дзяржаве: прыярытэтныя напрамкі і перспектывы развіцця» — прыме Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт. Чацвёртая секцыя на тэму «Інавацыі ў сферы вышэйшай адукацыі і навукі: досвед і перспектывы супрацоўніцтва Саюзнай дзяржавы» пройдзе на пляцоўцы Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ефрасінні Полацкай у Наваполацку. Гэтая ж установа адукацыі, але ў горадзе Полацку, прыме пятую секцыю, тэма якой «Супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў інавацыйнай сферы ў міжнародным кантэксце». Шостая секцыя — «Забеспячэнне тэхналагічнай незалежнасці Беларусі і Расіі на аснове інавацый у прамысловым комплексе» — адбудзецца на тэрыторыі найбуйнейшага прадпрыемства нафтахімічнай галіны ААТ «Нафтан». Секцыя пад нумарам сем будзе прысвечана тэме «Найноўшыя тэхналогіі аграпрамысловага комплексу Беларусі і Расіі, іх навуковае і кадравае забеспячэнне» (СПГ «Мазалава-газ», Віцебскі раён). Тэму «Супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў сферы лёгкай прамысловасці: ад ідэй — да інавацый» абмяркуюць падчас восьмай секцыі, якая пройдзе на базе ААТ «Віцебскія дываны». Дзявятая секцыя «Культурна-гуманітарнае супрацоўніцтва і развіццё турызму як фактар умацавання ўзаемадзеяння рэгіёнаў Беларусі і Расіі» адбудзецца ў Музеі беларускага кнігадрукавання ў Полацку.

Сярод мерапрыемстваў форуму — выстаўка дасягненняў народнай гаспадаркі рэгіёнаў Беларусі і Расіі, выстаўка-кірмаш Дамоў рамёстваў, выстаўка «Беларусь інтэлектуальная», прэзентацыя беларускіх і расійскіх рэгіёнаў і іншае.

Адным словам, аб усім раскажам і пакажам.

**Вераніка КАНЮТА.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Ушанаванне медыкаў, міжнародны візіт і дабрачыннасць

### Якім быў працоўны тыдзень сенатараў

● Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава прыняла ўдзел ва ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным 105-годдзю сістэмы айчыннай аховы здароўя і Дню медыцынскіх работнікаў. У вялікай зале Палаца Рэспублікі спікер агучыла прывітанне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у адрас медыцынскіх работнікаў. Звяртаючыся да найлепшых у сваёй справе работнікаў галіны, Наталля Качанава нагадала, што па традыцыі ў гэтыя чэрвеньскія дні ўшаноўваюць людзей, якія штохвілінна і штосекундна стаяць на варце здароўя нашых грамадзян — самага каштоўнага, што можа быць у чалавека, здароўя яго родных і блізкіх, а ў цэлым нашай беларускай нацыі. «Вы ведаеце, якая ўвага ў нашай краіне аддаецца сістэме аховы здароўя, — канстатавала Наталля Качанава. — Гэта адзін з прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. Прадугледжваецца фінансаванне, будуюцца новыя ўстановы аховы здароўя і рэканструююцца дзеючыя, набываецца новае сучаснае абсталяванне, з'яўляюцца новыя фармпрэпараты, якія выпускаюцца на нашых прадпрыемствах, функцыянуюць установы адукацыі, якія штогод рыхтуюць спецыялістаў для нашай галіны аховы здароўя. І ўсё гэта для нас вельмі важна, таму што на чале палітыкі, якая праводзіцца нашым Прэзідэнтам, — людзі». Старшыня Савета Рэспублікі падзякавала медыцынскім работнікам за нялёгкую працу.

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар ААТ «Камінтэрн» Ксенія Панцюхова ў складзе афіцыйнай дэлегацыі Гомельскай вобласці наведвала Кітайскую Народную Рэспубліку. Падчас візіту прадстаўнікоў Гомельшчыны ў кітайскую правінцыю Хэбэй прэзентаваны эканамічны, культурны, навуковы патэнцыял беларускага рэгіёна. Праведзены дзелавыя перагаворы з кіраўніцтвам правінцыі і яе гарадоў. Дэлегаты паўдзельнічалі ў буйным эканамічным форуме ў Ланфане. Партнёры з КНР выказалі зацікаўленасць у падпісанні кантрактаў з прадпрыемствамі Гомельскай вобласці. «У нас нямала пунктаў для развіцця ўзаемавыгадных сувязяў: машынабудаванне, сельская гаспадарка, лясная, хімічная і лёгкая прамысловасць, — адзначыла парламентарый. — У прыватнасці, дагаворы на дзясяткі мільёнаў юаняў з кітайскімі партнёрамі падпісалі ААТ «Рагачоўскі МКК», ААТ «Гомельскі хімічны завод», ААТ «Камінтэрн».

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Дзмітрый Баскаў у складзе хакейнай каманды Прэзідэнта ўзяў удзел у акцыі па бязвыплатным донарстве, прымеркаванай да Сусветнага дня донара крыві. Слоган кампаніі 2024 года — «Святкаванне 20-годдзя донарства: дзякуй донарам крыві». «І для гульцоў каманды Прэзідэнта, і для мяне асабіста гэта ўжо не першы выпадак донарства, — расказаў сенатар. — Можна сказаць, гэта ўжо наша камандная традыцыя. Спадзяюся, што сваім удзелам мы звернем увагу людзей на гэту, безумоўна, важную ініцыятыву і асабістым прыкладам падштурхнём далучыцца ў шэрагі донараў крыві, бо абсалютна незначная крываздача для здаровага чалавека можа ў будучыні выратаваць нечае жыццё».

**Вераніка КАНЮТА.**

# САМЫ ПРАЦЯГЛЫ ЎРОК

**«Цягнік Памяці» — унікальны патрыятычны праект, створаны па ініцыятыве кіраўнікоў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі. Ад яго першага старту ў 2022 годзе стала зразумела: гэта павінна стаць і стане добрай традыцыяй. Так яно і адбылося. Летась у «Цягніку Памяці» ехалі ўжо маладыя людзі ліцэя не толькі з Беларусі, Расіі, але і з Арменіі і Кыргызстана. Сёлета да патрыятычнага падарожжа далучацца юнакі і дзяўчаты з васьмі краін СНД. Пра гэта нядаўна на сумесным пасяджэнні расійскага і беларускага аргкамітэтаў паведаміў намеснік старшыні Савета Федэрацыі Канстанцін Касачоў.**
**А пакуль удзельнікі сёлетняга праекта рыхтуюцца ў дарогу (адправіцца цягнік з Брэста літаральна праз некалькі дзён), мы запісалі ўражанні беларускіх удзельнікаў праекта двух папярэдніх гадоў.**

## «Мы — апошняе пакаленне, якое сустракаецца з ветэранамі»

Дар'я Сытая, тады яшчэ вучаніца 10 класа Гродзенскай гарадской гімназіі № 10 імя Мітрапаліта Філарэта, у 2022 годзе ўвайшла ў склад удзельнікаў першага беларуска-расійскага праекта «Цягнік Памяці». Сёння яна ўжо студэнтка інжынерна-эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.

Аб тым, што Дар'ю вылучылі ў склад пасажыраў незвычайнага цягніка, яна даведалася яшчэ за год да праекта. Фактарамі для гэтага сталі добрая вучоба і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці гімназіі № 10. Школьніца неаднойчы брала ўдзел у гарадскіх і абласных алімпіядах па матэматыцы і гісторыі, з'яўлялася членам Маладзёжнага парламента пры Гродзенскім абласным Савеце дэпутатаў, дзе займалася прафарыентацыйнай дзейнасцю для пачатковых і сярэдніх класаў.

— Пачалі мы наш рух у Брэсце. Вельмі захапіла атмасфера таго дня. Мы ўсе накіраваліся ў Брэсцкую крэпасць. Перад вачыма разгарнулася гераічная карціна. Рэканструкцыя абароны крэпасці паўстала перад нашымі вачыма быццам наяве. Мы нібыта апынуліся ў тых далёкіх і гераічных падзеях першага дня вайны. Мы бачылі выбухі, чулі стрэлы, было адчуванне жаху. Калі сядзелі з дзяўчатамі і сачылі за падзеямі, я бачыла, як гэта ўсіх зачапіла. Усе былі вельмі ўсхваляваны, — расказала суразмоўніца.

Таксама незабыўным момантам стала сустрэча ў Брэсце са Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталляй Качанавай. Прагучала прапанова зрабіць гэты праект штогадовым, што, дарэчы, і адбылося.

Увесь маршрут быў складзены такім чынам, каб спалучыць гераічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны і сучаснасць, паказаць удзельнікам праекта ваенныя мемарыялы і прыгожыя мірныя гарады. Напрыклад, у Дар'і быў гонар за яе родны Гродна, хараство якога высока ацанілі пасажыры цягніка. Сама дзяўчына ўбачыла яго і з іншага, гераічнага боку. Разам з усімі яна пабывала на знакавых мемарыялах, даведалася аб жахлівых падзеях акупацыі горада.



— Падчас падарожжа я змагла ўбачыць нашу Беларусь нібы ў двух вымярэннях. З аднаго боку, гэта прыгожая, чыстая, развітая краіна. І, з другога боку, Беларусь, якая перажыла нямала страт і разбурэнняў у гады вайны, — выказвае думкі дзяўчына. — Такія пачуцці ўзнікалі і пры руху па тэрыторыі Расіі. Пад Масквой мы наведалі музей Вялікай Айчыннай вайны. Мноства павільёнаў аформлена дыярамамі, якія дапамагалі паглыбіцца ў тыя суровыя часы. Выстаўка апісвае літаральна кожны дзень вайны. Усе пакоі адпавядаюць самым знакавым ваенным падзеям. Увогуле, патрыятычная тэма суправаджала нас у кожным горадзе. Нас сустракалі ветэраны, віталі, расказвалі аб тых ваенных падзеях, сведкамі і ўдзельнікамі якіх былі. У такія моманты разумееш, што мы апошняе пакаленне, якое можа даведацца аб жахах вайны з першых вуснаў, і гэта бясцэнна.

— Хачу сказаць, што цягнік стаў свайго роду пунктам адліку маёй свядомасці. Гэта нібы прыступка ў дарослае жыццё, — гаворыць Дар'я.

Дарэчы, праз месенджар яна даведалася, што ў суседнім інтэрнаце жыве дзяўчына, з якой яна ехала ў адным вагоне цягніка. Цяпер дзяўчаты перыядычна сустракаюцца. У ВНУ, дарэчы, вучацца яшчэ некалькі ўдзельніц першага праекта. З усімі Дар'я падтрымлівае добрыя адносіны, а пры сустрэчах яны абавязкова ўспамінаюць аб тых незабыўных маршрутах. Такім чынам, першы праект працягвае звязваць удзельнікаў і сёння.

## «У кожнага ўдзельніка была свая вайна»

Сярод удзельнікаў праекта «Цягнік Памяці» ў мінулым годзе была навучэнка ліцэя Віцебскага дзяржуніверсітэта Юлія Сайко, пераможца рэспубліканскага конкурсу «Я патрыёт сваёй краіны».



Прадстаўніца Віцебшчыны ўспамінае, што старт беларуска-расійскага праекта быў дадзены 21 чэрвеня ў Брэсце. «Тут мы наведалі адно з самых запамінальных для мяне месцаў за ўвесь час паездкі — мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць». У Санкт-Пецярбургу мне больш за ўсё спадабаліся экскурсія па Летнім садзе і канцэрт для выпускнікоў «Пунсовыя ветразі».

З канцэрта мы вярталіся пешшу, таму была магчымасць прагуляцца па начной набярэжнай. Наступнымі гарадамі, якія наведалі, сталі Ніжні Ноўгарад, Уфа, Самара, Валгаград і Тула. Кожны з гэтых населеных пунктаў запомніўся: Ніжні Ноўгарад — жыццярадаснымі і пазітыўнымі людзьмі, яркім флэшмобам і найпрыгажэйшымі мастамі; Уфа — цудоўным заходам сонца, цікавымі традыцыямі і тым, як я і сябры-беларусы фатаграфаваліся з нашым дзяржаўным сцягам. Напэўна, тады, знаходзячыся за тысячы кіламетраў ад сваёй краіны, я адчула незвычайны гонар за тое, што нарадзілася і жыву ў Беларусі», — расказала Юлія.

У сувязі з тым, што «Цягнік Памяці» — ваенна-патрыятычны праект, падчас паездкі ўдзельнікі наведвалі памятныя мясціны Расіі і Беларусі. «Тады я ўбачыла, што ў кожнага ўдзельніка праекта была свая вайна. Многія плакалі пры наведванні Чырвонага Берага і Піскароўскіх могілак. Для мяне ўсведамленне таго, што такое вайна, прыйшло ў Валгаградзе, на Мамаевым кургане. Там, пад акуратнымі і дагледжанымі газонамі, ляжаць тысячы забітых савецкіх салдат: сыноў, мужоў, бацькоў. Вайна перастала быць старонкай у падручніку гісторыі, вайна кранула асабіста мяне. Мы ўскладалі кветкі да Вечнага агню ў Зале Воінскай славы, і я разумела, што гэта тое, што злівае рускага і беларуса, армяніна і кіргіза: агульны боль, агульная памяць», — гаворыць дзяўчына.

Ліза расказвае, што падчас праекта пасябравалі з многімі ўдзельнікамі, а на развітанне ніхто не змог стрымаць слёз. «Я ехала ў цягніку з дзвюма дзяўчатамі з Расіі і адной з Арменіі, — успамінае яна. — Мы вельмі весела бавілі час, гулялі, расказвалі адзін аднаму пра свае гарады, прасілі сваіх спадарожнікаў з іншых краін гаварыць нешта на іх роднай мове. І я хачу сказаць, што ўсе, хто ўдзельнічаў у праекце, былі вельмі адкрытымі і дружалюбнымі», — расказала дзяўчына.

## Засталіся ўспаміны, засталіся сябры

Андрэй Шаго (*на здымку другі справа*) ў гэтым годзе закончыў Пінкавіцкую сярэднюю школу імя Якуба Коласа Пінскага раёна. Цяпер у хлопца адказная пара выбару навучальнай установы, дзе ён будзе атрымліваць вышэйшую адукацыю. Андрэй усе школьныя гады паспяхова вучыўся, удзельнічаў у грамадскім жыцці школы і раёна, бываў на многіх мерапрыемствах. А вось праект «Цягнік Памяці» да гэтай пары згадвае як самую важную ўзнагароду, што выпала за гады вучобы.



Магчымасць паўдзельнічаць у конкурсе за склад будучай каманды «Цягніка памяці» Андрэй Шаго летась успрыняў з асаблівым энтузіязмам. Рыхтаваўся да творчага конкурсу, пісаў эсэ, рыхтаваў відэасюжэт пра малую радзіму. Расказаць пра вёску Пінкавічы любому яе жыхару, несумненна, ёсць што. Мясціна звязана з імем нашага класіка Якуба Коласа, тут ён настаўнічаў у маладыя гады. Згадаў Андрэй і ваенную гісторыю населенага пункта, паказаў помнік на месцы брацкай магілы воінаў і партызан, якія вызвалялі населены пункт у 1944 годзе.

Ну а пра само падарожжа Андрэй сказаў, што яно было захапляльным. Два тыдні праляцелі як адзін дзень: «Я даўно марыў пабываць у Полацку, знакавым для нашай гісторыі горадзе — дзеліцца ўспамінамі хлопец. — Там уразіў Сафійскі сабор, а яшчэ і тое, як нас прымалі. Для нас зладзілі цэлую гістарычную дзею з элементамі сярэдневяковага фестывалю. І ўжо стала зразумела, што ў кожным горадзе нас чакаюць адкрыцці. Здзівіў Ніжні Ноўгарад з яго прыгожай архітэктурай... Вядома, за шчасце было пабываць у Маскве і Санкт-Пецярбургу. Шмат разоў бачыў па тэлевізары скульптурную кампазіцыю у Валгаградзе пад назвай «Радзіма-маці кліча», але не ўяўляў, якой велічнай яна паўстае, калі бачыць гэты архітэктурны комплекс ужывую, знаходзіцца побач. Цікава было наведаць Ясную Паляну, дакрануцца да творчасці Льва Талстога... Вядома, пра кожны горад можна расказваць асобна, доўга. І тое, як мы ўдзельнічалі ў Дні Незалежнасці ў Мінску, як слухалі выступленне нашага Прэзідэнта. Засталося шмат здымкаў, запісаў, нататак».

Пасля прыезду найперш расказваў дома бацькам, сваякам. Потым — у школе настаўнікам і аднакласнікам, усе цікавіліся, прасілі паказаць здымкі. Засталіся яркія ўражанні, добрыя ўспаміны. «З беларускімі ўдзельнікамі праекта мы да гэтай пары трымаем сувязь, перапісваемся. З некаторымі нават ужо сустракаліся на розных мерапрыемствах, — працягвае Андрэй. — Адзін наш таварыш з расійскага Кургана прыязджаў на алімпіяду ў Брэст, мы з ім таксама пабачыліся. Адным словам, засталіся ўспаміны, засталіся сябры».

# ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАЎДЫ І СЯБРОЎСТВА

## «Кожнаму з нас проста хацелася моўчкі пастаяць і ўсвядоміць...»

Адным з удзельнікаў патрыятычнага праекта «Цягнік Памяці» ў 2022 годзе стаў Ягор Паляшчук. Маладога чалавека разам з аднакласніцай запрасілі ўзяць удзел у праекце, калі яны вучыліся ў 10 класе сярэдняй школы № 23 горада Барысава.



Па словах Ягора, ад удзелу ў мерапрыемстве засталіся самыя прыемныя ўражанні. Праект дазволіў хлопцу абзавесціся новымі знаёмствамі, у тым ліку з сябрамі з Расіі, з якімі малады чалавек падтрымлівае кантакт і па сёння.

Маладому чалавеку асабліва запомніліся месцы баявой славы і звязаныя з падзеямі тых гадоў мемарыялы. «Менавіта тут кожнаму з нас проста хацелася моўчкі пастаяць і ўсвядоміць усе тыя страшныя падзеі, якія тут адбываліся некалькі дзесяцігоддзяў таму, — дзеліцца Ягор. — Ніхто не застаўся абыякавым, і нават юнакі не стрымлівалі шчырых слёз. Вядомыя нам мемарыялы мы таксама ўбачылі па-іншаму. Усё гэта сапраўды ўмацавала пачуццё патрыятызму і гонару за краіну, у якой ты нарадзіўся і жывеш».

«Перакананы, што правядзенне такіх праектаў неабходна. Без ведання сваёй гісторыі будучыня немагчымая. Сёння гэтая тэма найбольш актуальная, асабліва цяпер, калі святкуем 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Кожны беларус павінен ведаць пра тое, што рабілася на нашай зямлі ў часы страшнага ваеннага ліхалецця і праз што давялося прайсці беларускаму народу. Бо захоўваць і шанаваць памяць — вельмі важна», — падагульніў Ягор Паляшчук.

Ульяна Шыманская з Дзяржынска таксама была ўдзельніцай «Цягніка Памяці» ў 2022 годзе. «Гэта быў дэбют патрыятычнага праекта «Цягнік Памяці», таму мне было асабліва цікава і вельмі ганарова ўзяць у ім удзел, — гаворыць дзяўчына. — Арганізацыя і тэматычнае напаўненне праекта былі на вельмі высокім узроўні. Усяго за 15 дзён наведалі каля 20 гарадоў Беларусі і Расіі. У кожным з іх былі арганізаваны цікавыя мерапрыемствы, падчас якіх нам распавядалі пра гісторыю ваенных гадоў. Мы наведвалі музеі, бывалі на тэрыторыях ваенных дзеянняў. Так, напрыклад, у горадзе Кубінка наведалі ваенна-патрыятычны парк культуры і адпачынку «Патрыёт». Тут паглядзелі на акопы, партызанскія зямлянкі, пункты медыцынскай дапамогі. Усё было вельмі рэалістычна. Акрамя таго, для нас правялі экскурсію па музейна-храмавым комплексе Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі. Таксама запомнілася ўнікальная канцэпцыя музейнага комплексу «Дарога памяці. 1418 крокаў да Перамогі».



«Патрыятычныя праекты такога плана найбольш актуальныя сёння. Яны прывучаюць моладзь аддаваць гонар традыцыям мінулага, ні ў якім разе не забываць пра іх. Дзякуючы праекту я навучылася адрозніваць крыніцы інфармацыі, бо ў наш час далёка не ўсяму можна верыць. Акрамя таго, я навучылася аддзяляць хлусню ад праўды, разбірацца, дзе ёсць ісціна, а дзе — фэйк. А гэта дарагога варта», — падкрэсліла суразмоўца.

## «Мы і цяпер на сувязі...»

Магіляўчанка Ліза Волкава сёлета скончыла магілёўскую сярэднюю школу № 38, і адзін з самых моцных успамінаў, які звязвае яе з установай, — гэта менавіта беларуска-расійскі праект «Цягнік Памяці». Стаць яго ўдзельнікам, як вядома, могуць толькі дзесяцікласнікі, якія дасягнулі поспехаў у вучобе і грамадскім жыцці. Ліза ж была выдатніца, скончыла школу з залатым медалём. На яе рахунку шмат добрых грамадскіх спраў. Яна з сябрамі наведвала ветэранаў, дзіцячыя садкі, дапамагала даглядаць бяздомных жывёл. Праект «Цягнік Памяці» даў ёй шмат новых эмоцый, дапамог пераканацца, наколькі моцным і бескарысным можа быць школьнае сяброўства, як шмат аднадумцаў жыве ў розных гарадах і краінах. Успамінае, што трапіць у яго было не так і проста.



— Паўдзельнічаць у праекце прапанавала мая настаўніца па гісторыі Юлія Хадускіна, — расказвае Ліза. — Яна мне дапамагла зрабіць візітоўку і зняць відэаролік. У ім я чытала верш Уладзіміра Дубоўкі «Беларусь — мая шыпшына» і праводзіла экскурсію на беларускай мове. Адзін эпізод здымалі каля помніка палкоўніку Сямёну Куцепаву, ён быў камандзірам палка, які абараняў Магілёў. Другі здымалі непасрэдна ў нашых гераічных Буйнічах... На абласных іспытах трэба было паказаць сваю візітоўку ўжо на сцэне, а яшчэ паўдзельнічаць у інтэлектуальным конкурсе і адказаць дзесьці на 50 пытанняў. Мяне моцна падтрымаў увесь клас, усе аднакласнікі прыйшлі ў Палац культуры вобласці з плакатамі, каб мяне натхніць.

Шмат гарадоў атрымалася пабачыць, але больш за ўсё магіляўчанцы запомнілася знаходжанне ў Самары, Санкт-Пецярбургу і Уфе. З беларускіх гарадоў Ліза адзначыла для сябе Брэст і Гродна, дзе пабывала ўпершыню. З усіх гарадоў пасылала фотаздымкі бацькам, каб яны таксама прасякнуліся атмасферай.

Патрыятычны складнік таксама быў вельмі моцны. З сябрамі па праекце абмяркоўвалі тэму вайны, расказвалі пра продкаў, якія ваявалі. Гісторыі былі вельмі кранальныя. І вельмі ўражвалі мемарыяльныя комплексы, на якіх атрымалася пабываць. Напрыклад, у Валгаградзе. «Калі такое бачыш, разумееш, якое гэта няшчасце — вайна, — прызнаецца Ліза. — Нават цяпер, калі ўспамінаю тыя мемарыялы, слёзы наварочваюцца».

Дзяўчына ўспамінае прабабулю Марыю, якая была яшчэ дзіцем, калі пачалася вайна. Яна расказвала праўнучцы, што было вельмі цяжка, ледзь выжылі. Ежы не хапала, збіралі і елі гнілую бульбу...

— Галоўнае, што пасля гэтага праекта застаецца шмат прыемных успамінаў аб гарадах і новых сябрах, — кажа Ліза. — З многімі з майго атрада — а нас было каля 50 чалавек — я і сёння на сувязі. Нядаўна абмяркоўвалі выпускныя экзамены. Расказваем, хто куды паступае. Магчыма, нехта ў адной ВНУ вучыцца будзе. Я, напрыклад, збіраюся паступаць у медыцынскі ўніверсітэт, хачу стаць анестэзіёлагам-рэаніматолагам. Праект даў мне мноства новых сяброў з розных гарадоў, і гэта цудоўна. Яго трэба абавязкова працягваць, бо ён вельмі важны і неабходны.

## «На многія рэчы пачынаеш глядзець па-іншаму»

Аляксандр Андык з Гомеля — не выпадковы пасажыр «Цягніка Памяці» — 2023. Для таго, каб трапіць на незабыўнае падарожжа, спачатку трэба было прайсці жорсткі адбор і перамагчы ў рэспубліканскім конкурсе «Я патрыёт сваёй краіны».




«Цягнік Памяці» — гэта ўнікальны патрыятычны праект. На самай справе мне запомнілася абсалютна ўсё: пачынаючы ад самога цягніка, наведвання цікавых месцаў, заканчваючы ўдзельнікамі мерапрыемства.

На думку Аляксандра, такія мерапрыемствы, як «Цягнік Памяці», вельмі важныя. «Кожны з нас павінен памятаць пра тое, якая была страшэнная Вялікая Айчынная вайна. У нашых сілах не дапусціць падобнай трагедыі», — адзначыў суразмоўца.

Акрамя незабыўнага вопыту і яркіх уражанняў, Аляксандр Андык набыў і новыя знаёмствы. «Я вельмі пасябраваў з прадстаўнікамі з Расіі. Так, напрыклад, мой добры сябар, з якім мы пазнаёміліся падчас удзелу ў праекце, у наступным месяцы прыедзе ў Беларусь, і мы зможам і далей падарожнічаць, разам пазнаваць новае і цікавае», — сказаў на заканчэнне ён.



Яшчэ адна ўдзельніца патрыятычнага праекта — Ксенія Баранкевіч з Ельска — таксама адна з пераможцаў конкурсу «Я патрыёт сваёй краіны».

На думку Ксеніі, «Цягнік Памяці» — гэта самы працяглы ўрок праўды і сяброўства. На ім запамінаецца ўсё. «Я назаўжды запомню сустрэчу са Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталляй Іванаўнай Качанавай і Старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Валянцінай Іванаўнай Матвіенка. Пасля знаёмства з імі на многія рэчы пачынаеш глядзець па-іншаму», — падкрэсліла суразмоўца.

Назаўсёды застануцца ў памяці маладых людзей і святочныя мерапрыемствы, якія праводзіліся ў Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. «Падчас паездкі мы ўбачылі шмат славутасцяў. У Беларусі, напрыклад, асабліва спадабаліся такія месцы, як Чырвоны Бераг, Лінія Сталіна, Белавежская пушча. Калі казаць пра Расію, то гэта, у першую чаргу, культурная сталіца — горад Санкт-Пецярбург... Шмат хто кажа, што Беларусь і Расія вельмі падобныя паміж сабой. Аднак гэта не зусім так: калі ўважліва прыглядзецца, абавязкова знойдзеш адрозненні», — распавяла дзяўчына.

На яе думку, правядзенне падобнага роду мерапрыемстваў сёння асабліва актуальнае: «Такія мерапрыемствы дапамагаюць зразумець моладзі, чым мы абавязаны нашым дзядам і прадзедам, якія змагаліся за наша мірнае жыццё. Акрамя таго, такія мерапрыемствы з'ядноўваюць, прымушаюць задумацца аб гістарычнай памяці, якую мы павінны шанаваць і перадаваць з пакалення ў пакаленне».

**Матэрыялы падрыхтавалі Маргарыта УШКЕВІЧ, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Святлана ЯСКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота з архіваў герояў.**

# З АМБУЛАТОРЫІ — У КРАМУ

## На выязной сесіі Брэсцкага абласнога Савета разглядалі пытанні аховы здароўя і гандлёвага забеспячэння сельскіх жыхароў

**Вывучаць работу, якая праводзіцца органамі ўлады рэгёна па павышэнні якасці медыцынскага і гандлёвага абслугоўвання сельскага насельніцтва, дэпутаты аблсавета выправіліся на канкрэтныя аб'екты Брэсцкага раёна. Была магчымасць не толькі наведаць ФАПы, амбулаторыі, магазіны, іншыя гандлёвыя аб'екты, але і паразмаўляць з людзьмі, пацікавіцца меркаваннем спецыялістаў і сельскіх жыхароў. Сесія атрымалася інфармацыйна насычанай, было што абмяркоўваць на пленарным пасяджэнні.**

### Мадэрнізацыя, камп'ютарызацыя, кадры

Яшчэ перад пачаткам работы член Савета Рэспублікі, **старшыня Брэсцкага абласнога Савета Ігар БРЫЛЕВІЧ** адзначыў, што аб'екты знарок выбіралі тыповыя: не лепшыя і не горшыя за іншыя, каб зразумець сапраўднае становішча, акцэнтаваць увагу на набытках і праблемах кожнай з галін.

Фельчарска-акушэрскі пункт у Клейніках найперш адметны яго загадчыцай — Вольгай Саладуха. Медработніка з 28-гадовым стажам паважаюць і цэняць жыхары населенага пункта. Клейнікі знаходзяцца непадалёку ад паўночна-ўсходняй ускраіны Брэста. Тут узводзяцца сімпатычныя катэджы, насельніцтва аграгарадка расце. А ў зону абслугоўвання ФАПа ўваходзіць яшчэ і суседняя вёска Пескі.

Памяшканне ФАПа даволі дыхтоўнае, нядаўна перажыло рамонт. Умовы не горшыя за гарадскія: асобна — працэдурна-перавязачны кабінет, прышчэпачны, педыятрычны і фельчарскі. Кожны тыдзень па графіку прыязджае і вядзе прыём участковы ўрач агульнай практыкі.

А з нядаўняга часу Вольга Мікалаеўна яшчэ два разы на тыдзень прымае пацыентаў на ФАПе вёскі Шумакі. Гэта ўстанова засталася без супрацоўніка. Праблему вырашылі вось такім чынам. Вольга Саладуха спраўляецца, тым больш што Шумакі — вёска ёй не чужая, гэта радзіма яе бацькоў. А будынак ФАПа заслугоўвае асобнай гаворкі. Пра яго гісторыю расказаў **Аляксандр РАБЕЖКА, галоўны ўрач Брэсцкай гарадской бальніцы № 2,** да якой адносіцца сістэма аховы здароўя Брэсцкага раёна.

— Фельчарска-акушэрскі пункт размешчаны ў будынку былой карчмы, якая была ўзведзена ў Шумаках больш за 400 гадоў таму, — сказаў Аляксандр Міхайлавіч. — Пазней будынак займала тутэйшая пажарная каманда. Пасля вайны яго аддалі пад сельскую школу. А з 1970 года былая карчма служыць справе аховы здароўя. Летась на рамонт было выдзелена каля 65 тысяч рублёў. Абноўлены фасад будынка, яго дах, вокны і дзверы, агароджа. Сюды прыходзяць па медДапамогу жыхары вёсак Шумакі, Костычы, Цэрабунь, Нэплі, Кацельня Баярская — усяго 449 чалавек, з іх 87 дзяцей. У Шумаках з 1 жніўня будзе працаваць на пастаяннай аснове выпускнік Брэсцкага медыцынскага каледжа.

Цікава, што будынак мае пячное ацяпленне. На гэта звярнуў увагу ўдзельнікаў нарады старшыня аблсавета Ігар Брылевіч. Але ж калі печ спраўная, калі зімой у ёй паліцца кожны дзень, у будынку падтрымліваецца нармальная тэмпература, тут можна прымаць людзей і працаваць з пэўным камфортам.

У гэтай жа вёсцы дэпутаты пазнаёміліся з работай перасоўнага медыцынскага пункта, які працуе ў раёне з сярэдзіны 2023 года. Ён абслугоўвае аддаленыя вёскі, запатрабаваны ў людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Апошнім часам, згодна з распараджэннем кіраўніка дзяржавы, перасоўныя медыцынскія комплексы сталі выязджаць на мехдвары, у гаспадаркі. З дапамогай гэтага комплексу ўжо абследавалі механізатараў, іншых спецыялістаў некалькіх гаспадарак. Асабліва ў гарачую пару пасяўной альбо ўборкі механізатары, вадзіцелі працуюць часта ад цямна да цямна, ім складана трапіць на прыём да ўрача ці фельчара ў гадзіны прыёму. А тут чалавек мае



магчымасць прайсці дыспансерызацыю без адрыву ад вытворчасці.

Наведалі ўдзельнікі сесіі і амбулаторыю ў Матыкалах. Названая ўстанова аховы здароўя паказальная тым, што на яе мадэрнізацыю за апошнія гады пайшло 2,5 мільёна рублёў. У будынку раней размяшчаўся дзіцячы садок, першы раз яго рамантавалі крыху больш за дзесяць гадоў таму. Збольшага абнавілі, але давесці да ладу канчаткова тады не хапіла сродкаў. У 2019 годзе былі выдзелены грошы, выраблена праектна-каштарысная дакументацыя і праведзена першая чарга мадэрнізацыі. Тады хапіла сродкаў на замену даху і акон. У 2022 годзе з абласнога бюджэту было выдзелена 1,8 мільёна рублёў. У выніку іх асваення амбулаторыя ператварылася ў сучасную ўстанову аховы здароўя, дзе ёсць усё неабходнае для аказання кваліфікаванай дапамогі. Набылі і абнавілі неабходнае абсталяванне, у тым ліку стаматалагічнае. Тут працуе ўсяго 18 чалавек, з іх — тры ўрачы. У радыусе абслугоўвання ўваходзіць восем населеных пунктаў, дзе пражывае 3100 чалавек. Амбулаторыя сення адна з найлепшых у вобласці. Такім чынам, удзельнікі сесіі ўбачылі аб'ект, на які варта раўняцца. У ходзе экскурсіі падкрэслівалася, што камп'ютарызацыяй ахоплены ўсе ўстановы здароўя раёна, усе яны падключаны да спецыяльнай праграмы.

Падчас пленарнага пасяджэння дэпутаты ўсебакова абмеркавалі становішча з сельскай медыцынай. Прагучала нямала крытыкі ў адрас асобных устаноў, якія наведвалі прадстаўнікі розных службаў у парадку маніторынгу сітуацыі. Галоўным пасылам абласнога прадстаўнічага органа ўлады стала патрабаванне дробныя хібы выправіць у сціслыя тэрміны, а кожны ФАП, кожная амбулаторыя павінны забяспечваць якасныя паслугі насельніцтву.

Узнікла яшчэ адно пытанне, якое не маглі абысці ўдзельнікі сесіі падчас пасяджэння. Рэч у тым, што рашэннем Міністэр-



ФАП у Шумаках — былая карчма.

ства аховы здароўя тэрмін знаходжання грамадзян на ложках бальніц сястрынскага догляду цяпер абмежаваны 180 днямі. А што рабіць далей, калі ў чалавека нікога няма і няма паказанняў, напрыклад, для яго шпіталізацыі ў стацыянар? Пытанне трэба прапрацоўваць. Некаторыя шляхі вырашэння праблемы былі агучаны на сесіі. Як падкрэсліў Ігар Брылевіч, ніводзін грамадзянін з гэтай катэгорыі не будзе выпісаны з бальніцы сястрынскага догляду без яснай перспектывы яго далейшага знаходжання альбо лячэння.

### Сацыяльная функцыя і не толькі

